

ЯКІМ МОЖА БЫЦЬ ЖЫЦЦЁ НА ПЕНСІІ 4

ПОШУКІ МАКСІМА МАРХАЛЮКА ПРАЦЯГВАЮЦЦА МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ВЕРАСНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 174 (29041)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іна МЯДЗВЕДЗЕВА, старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта:**

*«Перапіс дае карэктную інфармацыю аб колькасці насельніцтва, колькасці хатніх гаспадарак, сем'ях (колькі, якія яны, уся дэмаграфічная раскладка). І гэта дазваляе карэктна выбудаваць работу ўсёй дзяржавы. Мы даём унікальную інфармацыю пра тое, як размешчаны працоўныя рэсурсы, чаму насельніцтва не працуе ў адным горадзе, а едзе ў іншы і г. д. Раз на дзесяць гадоў мы атрымліваем інфармацыю аб фактычным беспрацоўі. Штоквартальна публікуем даныя выбарачнага абследавання па вывучэнні занятасці, у якім удзельнічае невялікі працэнт насельніцтва. Самае галоўнае, што мы атрымліваем, — прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Наступныя 10 гадоў будзем будаваць разлікі і прагнозныя параметры, грунтуючыся на выніках перапісу».*

# Коні Якава



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Былы сталічны жыхар, а цяпер гаспадар сялянска-фермерскай гаспадаркі ў вёсцы Скрабатуны Глыбоцкага раёна Якаў СЕРАФІМОВІЧ шмат гадоў займаецца конегадоўляй. У яго табуне шмат коней роднай мясцовай пароды — беларускіх вупражных. А гаспадарка яго завецца «Конны фальварак» і ўваходзіць у кааператыў па развіцці аграэкатурызму «Вялесаў шлях».

## КОРАТКА

- **Лягсасы Беларусі, як мяркуецца, будуць пераўтвораны ў дзяржаўныя казённыя прадпрыемствы.**
- Беларускі рубель на таргах 12 верасня ўмацаваўся да трох асноўных валют.
- **Астанкі чатырох чырвонаармейцаў знайшлі пошукавікі ў Маларыцкім раёне.**
- Беларуска Дар'я Домрачава і яе муж Уле-Эйнар Б'ёрндален падпісалі кантракт з Нацыянальным алімпійскім камітэтам Кітая. Яны будуць рыхтаваць біятлонную зборную гэтай краіны (мужчынскую і жаночую каманды) да зімовай Алімпіяды-2022, якая пройдзе ў Пекіне.

Надвор'е

## Восень бярэ верх

**З такім цёплым надвор'ем, якое выдалася ў першай палове верасня, Беларусі шанцуе нячаста — адзін раз на дзесяць-пятнаццаць гадоў. Сярэднясутачная тэмпература паветра перавышала норму на 2-4 градусы. Здавалася б, цёплы верасень і халодны ліпень памяняліся месцамі, але... Восень пачне свой імклівы наступ без пераходнага перыяду. Пра тое, што нас чакае ў будучыя выхадныя, расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.** СТАР. 3



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

50+

## СТАРЭННЕ — НЕ ПАГРОЗА

### Як прыйсці да актыўнага даўгалецця?

**Сёння ў нашай краіне 22 % насельніцтва перасягнула 60-гадовы рубеж. Прагназуецца, што да 2025 года гэтая лічба складзе ўжо 28 %. Паводле класіфікацыі Сусветнага банка Беларусь адносіцца да краін, якія інтэнсіўна старэюць. У будучыні, як мяркуюць спецыялісты, яшчэ большая частка насельніцтва нашай краіны будзе пажылой. Чым на гэта адказа грамадства і якія меры неабходныя, каб сталыя людзі захоўвалі здароўе і працягвалі актыўнае жыццё? Пра гэта і іншае расказалі спецыялісты.**

### КОЖНЫ ЧАЦВЁРТЫ — ПЕНСІЯНЕР, ТРЭЦЬ З ІХ ПРАЦУЕ

— Сацыялізацыя пажылых людзей — важны аспект. Заканадаўчая і выканаўчая ўлады павінны інтэграваць намаганні, каб мець магчымасць выкарыстоўваць іх патэнцыял на карысць грамадства і дапамагчы сталаму чалавеку захаваць свае функцыі для актыўнага даўгалецця, — адзначыла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Людміла КАНАНОВІЧ.** СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

# МЫ ЗАЦІКАЎЛЕНЫ ВА ЎСІХ

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ва ўрачыстай абстаноўцы прыняў даверчыя граматы кіраўнікоў трынаццаці дыпламатычных місій у Рэспубліцы Беларусь

**— Шчыра спадзяюся, што, як і многія вашы папярэднікі, вы прымеце сэрцам Беларусь, — звярнуўся да новапрызначаных замежных дыпламатаў кіраўнік дзяржавы. — Адкрыеце для сябе новую культуру, магчыма, знойдзеце ў ёй для сябе нешта блізкае і сугучнае з традыцыямі свайго народа. Убачыце, якія цудоўныя людзі тут жывуць — душэўныя, адкрытыя, талерантныя.**

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што пачатак місіі прадстаўнікоў замежных дзяржаў супадае з важнай палітычнай падзеяй у краіне — парламенцкімі выбарамі. «І вы зможаце асабіста пераканацца, што электаральная кампанія пройдзе ў строгай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і патрабаваннямі агульнапрынятых сусветных стандартаў, — не сумняваецца лідар краіны. — Упэўнены, што які б выбар ні зрабіў беларускі народ на карысць тых або іншых кандыдатаў, гэта будзе выбар курсу на далейшае будаўніцтва суверэннай дзяржавы, эвалюцыйнае развіццё і памнажэнне нашых дасягненняў».

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што Захад заўсёды папракаў Беларусь у тым, што электаральныя кампаніі ў краіне праходзяць нецікава. «Але па першых днях, нават не пачатак агітацыі, а проста першыя дні збору подпісаў, — ужо вельмі весела», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заявіў, што Беларусь праводзіць адкрытую, міралюбную і шматвектарную знешнюю палітыку. «Мы гатовы да цеснага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з усімі замежнымі партнёрамі, незалежна ад іх палітычнага ўплыву, геаграфічнай аддаленасці і эканамічнага патэнцыялу, — запэўніў ён. — Нашы ініцыятывы па захаванні міру і стабільнасці ў рэгіёне вядомыя ўсім.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, рознагалоссі ключавых сусветных гульцоў у сферы кантролю над узбраеннямі зноў абвастраюць актуальнасць выпрацоўкі новых падыходаў у забеспячэнні міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі і тым самым павялічваць запатрабаванасць беларускай ініцыятывы аб аднаўленні адпаведнага міжнароднага дыялогу.

«Мы будзем і надалей заклікаць не толькі вялікія, але і невялікія дзяржавы да прыняцця адпаведных мер па ўмацаванні даверу і эканамічнай стабільнасці», — паабяцаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што ад дыпламатаў у значнай ступені будзе залежаць не толькі характар двухбаковых адносін паміж дзяржавамі, але і ўзровень узаемнага даверу і разумення.

Традыцыйна Аляксандр Лукашэнка сказаў некалькі слоў аб узаемадзеянні з кожнай дзяржавай, якую прадстаўляюць новыя паслы.

Расія — асноўны стратэгічны партнёр і саюзнік Беларусі, а адносіны двух брацкіх народаў замацаваныя вузамі дружбы, добрасуседства і агульнымі, часам крывавымі, старонкамі гісторыі, сказаў ён. «Мы пралівалі гэту кроў за тое, каб у Еўропе і свеце было спакойна, і не мы пачыналі гэтыя войны, але мы заўсёды (Гасподзь нам дапамагаў у гэтым) выходзілі пераможцамі. Мы гэта помнім. Мы заўсёды там былі разам і таму перамагалі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Цяпер асаблівая ўвага аддаецца пытанням саюзнага будаўніцтва. Мы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Уладзіміравічам Пуціным дамовіліся, што напярэдадні знакавай даты — 20-годдзя падпісання дагавора аб стварэнні нашага саюза — павінны быць прынятыя канкрэтныя рашэнні па далейшай стратэгіі развіцця інтэграцыі. І мы гэта зробім», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Казахстан — стратэгічны партнёр Беларусі ў Еўразійскім рэгіёне. «Мы скіраваны на далейшае пашырэнне і дыверсіфікацыю гандлёва-эканамічных сувязяў», — ахарактарызаваў іх лідар краіны.

Прыярытэтнай задачай ва ўзаемадзеянні з іншым партнёрам па ЕАЭС — Кыргызстанам — кіраўнік дзяржавы назваў нарошчванне тавараабароту з выкарыстаннем эканамічнай інтэграцыі.

«У апошнія гады нам удалося істотна прасунуцца наперад у дыялогу з Еўрапейскім саюзам, які з'яўляецца для нас адным з найбольш значных гандлёвых партнёраў, важнай крыніцай інавацый, неабходных для мадэрнізацыі і павышэння канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы скіраваны на выбудову добрасуседскіх і прагматычных адносін з Саюзам, якія не прадугледжваюць выбару паміж Усходам і Захадам (праўда, Еўрасаюз ад нас гэтага і не патрабуе). Упэўнены, што гэтаму ў значнай ступені паспрыяў бы прагрэс у спалучэнні еўрапейскага і еўразійскага інтэграцыйных працэсаў».

Развіццё ўсебаковага ўзаемадзеяння з краінамі Балтыйскага рэгіёна лідар Беларусі назваў нязменным прыярытэтам. «Для нашай дзяржавы прынцыпова важным з'яўляецца далейшае пашырэнне і паглыбленне ўзаемавыгадных адносін з Латвійскай Рэспублікай на аснове прынцыпаў добрасуседства і ўзаемапавагі», — дадаў ён.

Беларусь зацікаўлена ў нарошчванні разнапланавага супрацоўніцтва з Федэратыўнай Рэспублікай Германія, разлічвае на інтэнсіфікацыю двухбаковага ўзаемадзеяння, перш за ўсё ў гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай галінах, запэўніў Прэзідэнт.

«Мы гатовы да далейшага канструктыўнага развіцця адносін з Вялікабрытаніяй па ўсіх ключавых кірунках, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Дыялог са Злучаным Каралеўствам мае асаблівае значэнне з улікам рашэння брытанскага народа аб выхадзе з Еўрасаюза і новай ролі краіны на міжнароднай арэне».

Прэзідэнт пацвердзіў таксама інтарэс Беларусі да пашырэння палітычных, эканамічных і культурных сувязяў з Харватыяй, Балгарыяй, Швейцарыяй, Гватэмалай, Танзаніяй і Эфіопіяй.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў замежных паслоў, што яны заўсёды знойдуць разуменне не толькі з боку кіраўнікоў беларускіх прадпрыемстваў, рэгіёнаў, Міністэрства замежных спраў, але і з яго боку асабіста.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Мясцовая ўлада, паслы і кіраўнікі двух заводаў

## Прэзідэнт разгледзеў кадравыя пытанні

**Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў прызначэнне пяці новых кіраўнікоў раёнаў: у Буда-Кашалёўскі — Анатоля Гапоніка, у Лельчыцкі — Сяргея Касінскага, у Лідскі — Сяргея Ложачніка, у Шчучынскі — Аляксея Садоўскага, у Салігорскі — Андрэя Жайловіча.**

### Заробкі павінны расці

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу старшынь райвыканкамаў на галоўных кірунках іх дзейнасці — ад сферы сельскай гаспадаркі да выплаты заробкаў на прадпрыемствах. Усе патрабаванні застаюцца нязменнымі, падкрэсліў Прэзідэнт.

«Трэба належным чынам завяршыць уборку ўраджаю, — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы. — Хацелася б, каб налета (а мы ўжо пачалі здаваць экзамен) тыя, хто зарабіў добрыя грошы, атрымалі іх. Трэба, каб зарплата расла, дынаміка тут павінна быць». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што гэта не павінна быць «дарэмнаплата»: грошы павінны быць зароблены.

«Раёны, у якія вы ідзяце, нядрэнныя, там можна працаваць. Людзі вы абсалютна ўсе перспектыўныя. Вельмі б хацелася, каб гэта новае пакаленне, якое вы прадстаўляеце, прыжылося і мы з узроўню старшыні райвыканкама атрымалі канкурэнцыю на пасадах міністраў, губернатараў, членаў урада. Я як Прэзідэнт не магу спакойна сысці і жыць, калі не прывяду ва ўладу новае пакаленне», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«У палітыцы, я ўжо сказаў, мы пачалі здаваць экзамен. Сённяшняя перадвыбарная вакханалія, інакш яе не назавеш, перад парламенцкімі выбарамі кажа пра тое, што гэта проста рэпетыцыя прэзідэнцкіх выбараў. Нам паспрабуюць не дазволіць спакойна правесці гэтыя выбары. А мы павінны правесці так, як мае быць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — У краіне кіраванай, у нашай краіне мы павінны правесці гэтыя выбары. І калі мы вызначыліся, што будзем дзейнічаць так, так і так, тактыка такая, мы павінны яе прытрымлівацца».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што калі падчас парламенцкай кампаніі будуць крытыкаваць і наносіць удары па нейкіх людзях, то гэта будуць удары з далёкім прыцэлам — па Прэзідэнце. «Так і адбываецца цяпер. Часам б'юць незаслужана, непрыстойна, несумленна, цэляцца ў Прэзідэнта. Я да гэтага гатовы. Хачу, каб вы былі гатовыя і ведалі, што мы не можам дазволіць расхістаць краіну. Каму гэта хочацца зрабіць, вы ведаеце», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што сёння ўсе пытанні — эканоміка ў рэгіёнах, заработная плата ў працоўных калектывах, кадры і жыццё людзей у цэлым — ляглі на плечы мясцовых органаў улады. «Трэба дапамагчы — кажыце», — падкрэсліў Прэзідэнт.

### Паслы патрэбны моцныя

Прэзідэнт прызначыў пяць новых кіраўнікоў дыпламатычных місій Беларусі ў замежных краінах. Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом у Арабскай Рэспубліцы Егіпет і па сумяшчальніцтве ў Рэспубліцы Судан і Амане, Пастаянным прадстаўніком Беларусі пры Лізе арабскіх дзяржаў прызначаны Сяргей Цярэнцьеў. Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом у Дзяржаве Ізраіль прызначаны Яўген Вараб'ёў. Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом у Рэспубліцы Эквадор і па сумяшчальніцтве ў Калумбіі, Нікарагуа і Панаме прызначаны Мікалай Аўсянка. Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом у Турэцкай Рэспубліцы і па сумяшчальніцтве ў Іране прызначаны Віктар Рыбак. Вячаслаў Бяскосты прызначаны паслом Беларусі ў Туркменістане.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў міністра замежных спраў Уладзіміра Макея, ці знойдзецца работа для Андрэя Савіных, які мае намер удзельнічаць у парламенцкіх выбарах, у выпадку няўдачы ў выбарчай кампаніі. Міністр запэўніў, што ў гэтым выпадку пасол Савіных зойме высокую пасаду ў міністэрстве. Прэзідэнт заўважыў, што і ў парламенце, з якім МЗС павінен увесь час быць у кантакце, такія людзі патрэбны.

Прэзідэнт Беларусі спытаў, наколькі новапрызначаны беларускі пасол у Туркменістане ведае гэту краіну.

«З Туркменістанам у нас заўсёды былі бліскучыя адносіны, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — І тыя праблемы, якія сёння існуюць, яны былі і будуць заўсёды з любымі дзяржавамі. Трэба сустрэцца са службовымі асобамі, якія займаліся будаўніцтвам Гарлыкскага камбіната, трэба выходзіць з гэтай сітуацыі годна. Гэта не справа, што мы з сяброўскім народам пачынаем у судах ладзіць разборкі».

Каментуючы прызначэнне Сяргея Цярэнцьева, Прэзідэнт сказаў: «У Егіпце мы маем добрыя карані, аснова закладзена. У Судане таксама трэба пацюху, па некалькі праектаў... Так, як у Эквадоры».

Адносна Турцыі кіраўнік дзяржавы пагадзіўся з міністрам замежных спраў, што тут галоўная задача — збалансаваць узаемны гандаль.

«Ужо павінна прыходзіць новае пакаленне людзей, — падсумаваў знаёмства з беларускімі дыпламатамі Аляксандр Лукашэнка. — Мы некалі сыдзем, не такі далёкі гэты час, а павінны прыйсці людзі, якія захаваюць краіну. І паслы павінны быць такімі людзьмі. Трэба, каб знешнепалітычнае ведамства было магутнае і перспектыўнае».

### Рэалізацыя — клопат саміх вытворцаў

Прэзідэнт Беларусі даў згоду на прызначэнне новых генеральных дырэктараў у ААТ «Гомельшкло» і ААТ «Планар». ААТ «Гомельшкло» ўзначаліць Пётр Максімчыкаў, генеральным дырэктарам ААТ «Планар» стане Сяргей Авакаў.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў апошняга, ці ўсе прадпрыемствы холдынга загружаныя, ці атрымліваюць заробкі яго супрацоўнікі.

«Гомельшкло» кіраўнік дзяржавы назваў асаблівым прадпрыемствам у сваім лёсе. «Мы яго выцягвалі за вушы, — нагадаў ён. — Прадпрыемства выраблае добрую прадукцыю, але ў мяне былі пытанні па збыце». Ён папярэдзіў новага генеральнага дырэктара, што ніякіх скідак тут не будзе.

«Ніколі не слухайце нікога, хто б да вас ні прыйшоў і ні сказаў, што ён ад імя Прэзідэнта, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да кіраўніка завода. — Ад імя Прэзідэнта толькі Прэзідэнт кажа... Усіх гэтых шарлатанаў на парог не пускайце! Займайцеся рэалізацыяй прадукцыі самі. А то атрымліваецца: вырабіць можам, якасна можам, а прадаць — за паўцаны. А жуллё рознае — пасрэднікі — па кішэнях раскладвае палову грашовых сродкаў. Гэтага не будзе! Таму мы і звярнулі ўвагу на «Гомельшкло».

Пётр Максімчыкаў паабяцаў выправіць сітуацыю ў самым хуткім часе.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Аты-баты

## Да вучэнняў гатовы!

**Вайскоўцы Беларусі і Расіі сёння пачнуць здаваць сур'ёзны тэст на боегатоўнасць. У Ніжагародскай вобласці на палігоне паблізу населенага пункта Муліна сёння пачынаюцца вучэнні «Шчыт Саюза — 2019».**

Да месца падзей ужо прыбыло прыблізна 4 тысячы ваенных з Беларусі. На час вучэнняў яны будуць жыць ва ўладкаваных палявых лагерах, якія ўяўляюць сабой сучасны ваенны гарадок.

Сярод тэхнікі, адпраўленай на вучэнні, — больш за 30 танкаў, 80 баявых браніраваных машын, каля 50 рэактыўных сістэм залпавага агню і мінамётаў. Паветраны эшалон складуць паўтара дзясятка самалётаў і верталётаў.

Кіраваць вучэннямі будуць ад Беларусі першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Алег Белаконеў, а ад Расіі — камандуючы войскамі Заходняй ваеннай акругі Узброеных Сіл Аляксандр Жураўлёў.

Нагадаем, што падобныя вучэнні праводзяцца раз на два гады па чарзе на тэрыторыі Беларусі і Расіі. Легенда вучэння распрацавана з улікам аналізу магчымых варыянтаў узнікнення ваеннай пагрозы Саюзнай дзяржаве і разгортвання ваеннага канфлікту.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Выбары-2019

# ЁСЦЬ ПЕРШЫ КАНДЫДАТ

## Зарэгістравана ўжо 350 ініцыятыўных груп кандыдатаў у дэпутаты

**Усяго пададзена на рэгістрацыю 446 заяў, большасць з іх — 120 — у сталіцы. У Магілёўскай вобласці — 59, на Міншчыне — 73, на Брэстчыне — 54, у Гродзенскім рэгіёне — 44, на тры запыты больш у Гомельскай вобласці, Віцебскі рэгіён прадстаўлены 49 заявамі. «На гэты момант калі вызначаныя асобы збяруць подпісы, то мы кажам ужо пра добрыя альтэрнатыўныя выбары», — расказала на сустрэчы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.**

Пры гэтым з 350 зарэгістраваных заяў адна адазваная і чатыром грамадзянам адмоўлена. Прычыны — няправільнае афармленне дакументаў, невытрымліванне колькасці членаў ініцыятыўных груп, наяўнасць судзімасці, рэгістрацыя яшчэ адной групы.

Вылучэнне кандыдатаў ідзе з мінулай нядзелі і працягнецца да 7 кастрычніка ўключна.

«Што датычыцца тых мерапрыемстваў, якія здзяйсняюцца, у прынцыпе, яны адбываюцца без асаблівых канфліктаў», — так ахарактарызавала ход выбарчай кампаніі на гэтым этапе старшыня Цэнтрвыбаркама.

Сфарміраваны акруговыя і тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі. У параўнанні з кампаніяй 2016 года ў іх складзе паменшылася колькасць дзяржаўных служачых і моладзі да 30 гадоў, але павялічылася прадстаўніцтва жанчын. Больш актыўна вызначыліся ў камісіях члены палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў.

Лідзія Ярмошына паведаміла, што ў суды пададзена 23 скаргі на неўключэнне ў камісіі. З 5 жніўня да 11 верасня ў ЦВК паступіла 65 зваротаў. Чвэрць з іх датычылася пытанняў, не звязаных з кампаніяй, у астатніх выказваліся незадаволенасць датай выбараў і просьбы аб тлумачэнні заканадаўства ў гэтай сферы.

Па звестках на чацвер у Беларусі ўжо быў адзін вылучаны кандыдат — Дзмітрый Ягораў з Віцебшчыны. Ён прадставіў усе неабходныя дакументы і чакае толькі рэгістрацыі.

Кампанія праходзіць з шырокім складам назіральнікаў. Цэнтральнай выбарчай камісіяй акрэдытавана сем назіральнікаў ад палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў — Беларускі Хельсінскі Камітэт, ЛДП, «Белая Русь», БНФ, «Справедливый мир», БРСМ, Саюз жанчын. Акрэдытацыю атрымала 30 чалавек ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Акруговымі і тэрытарыяльнымі камісіямі адобраны 261 назіральнік. Большасць з іх — прадстаўнікі «Белай Русі», БРСМ, Саюза жанчын.

З 9 верасня пачалося вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі. З 9 да 13 кастрычніка ЦВК павінна правесці іх рэгістрацыю.

На пытанне журналістаў аб удзеле ў выбарах партый кіраўнік Цэнтрвыбаркама адказала, што шэраг з іх заўсёды ўдзельнічае ў выбарах, а найбольшую колькасць ініцыятыўных груп зарэгістравала Кампартыя.

Мінулыя выбары ў парламент вызначыліся высокім конкурсам — 4,5 чалавека на мандат. Адносна сёлетняй сітуацыі Лідзія Ярмошына выказалася наступным чынам: «Цяжка сказаць. Хочацца, каб конкурс быў усюды. То-бок каб у нас не было безальтэрнатыўных акруг».

Ацэначная місія БДІПЧ АБСЕ, якая працавала ў жніўні ў Беларусі, рэкамендавала арганізацыі накіраваць у нашу краіну 30 доўгатэрміновых і 400 кароткатэрміновых назіральнікаў.

Расказала Лідзія Ярмошына, якім чынам адбудзецца перадача паўнамоцтваў новаму складу дэпутатаў. Пасля прызнання вынікаў выбараў на апошнім пасяджэнні Палата прадстаўнікоў мінулага склікання прымае рашэнне аб закрыцці. Адбываецца гэта, як правіла, за 1-2 дні да склікання новай сесіі. Абнулены склад, на думку старшыні ЦВК, пачне сваю работу не раней за снежань.

Не ўступяць у сілу напярэдадні выбараў і раней анансаваныя папраўкі ў Выбарчы кодэкс. «Яны могуць быць прынятыя, але ўступіць у сілу напярэдадні выбараў — гэта неверагодна», — пракаментавала старшыня Цэнтрвыбаркама.

ЦВК, па словах Лідзіі Ярмошынай, не збірае інфармацыю па значных асобах, якія балатуюцца ў дэпутаты: «Мы самі з газет даведваемся. Для мяне ўсе кандыдаты аднолькавыя». Напрыклад, на сайце Мінгарвыканкама змешчана інфармацыя, што зарэгістраваны ініцыятыўныя групы прадзюсара, вядомага вядучага Тэнгіза Думбадзэ, старшыні «Белай Русі» Генадзя Давыдзькі, «Міс Беларусь» Марыі Васілевіч.

Лідзія Ярмошына анансавала чарговае пасяджэнне ЦВК 24 верасня. На ім будуць разглядацца пытанні аб забеспячэнні бесперабойнага асяроддзя падчас галасавання, стварэнні ў дзень выбараў інфармацыйнага цэнтра. Старшыня ЦВК спадзяецца, што падчас пасяджэння будзе магчымасць падзяліць эфірны час.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнт Інданезіі мае намер рэфармаваць урад



Прэзідэнт Інданезіі Джока Відода, пераабраны ў красавіку на другі тэрмін, мае намер правесці рэформу кабінета міністраў з мэтай скарачэння бюракратычнага апарату, які перашкаджае прыцягненню ў краіну замежных інвестыцый. Пра гэта паведаміла газета The Straits Times са спасылкай на крыніцы ў адміністрацыі прэзідэнта. У прыватнасці, адным з адпаведных крокаў можа стаць з'яўленне новага міністэрства інвестыцый, куды ўвойдуць існуючыя цяпер асобна міністэрствы гандлю і прамысловасці. Па звестках газеты, нядаўна на пасяджэнні ўрада Відода выказаў вялікае незадавальненне сітуацыяй, звязанай з пераносам прамысловых прадпрыемстваў з Кітая ў іншыя краіны. Паводле яго слоў, з чэрвеня да жніўня сама менш 33 буйныя замежныя кампаніі з-за гандлёвай вайны КНР і ЗША вырашылі абраць новыя пляцоўкі для сваіх вытворчасцяў: большасць перанеслі ў В'етнам, таксама ў Індыю, Камбоджу, Малайзію, Мексіку, Сербію, Тайланд. «Каб адкрыць завод у В'етнаме, трэба каля двух месяцаў, а ў Інданезіі — каля года», — заявіў прэзідэнт.

### На Багамах знікла 2,5 тысячы чалавек

Каля дзвюх з паловай тысяч чалавек лічацца зніклымі без вестак на Багамскіх астравах пасля разбуральнага ўрагану «Дорыян». Стыхія абрынулася на архіпелаг у пачатку верасня. Па афіцыйных звестках, ахвярамі ўрагану стала не менш чым 50 чалавек. На астравах разбурана ці пашкоджана каля 13 тысяч будынкаў, вялікія тэрыторыі апынуліся пад вадой. Прадстаўнікі Сусветнай харчовай праграмы (WFP) паведамляюць, што накіравалі на Багамы экспертную групу, прадстаўнікі якой дапамогуць ацаніць шкоду і зразумець, у чым жыхары астравоў перш за ўсё маюць патрэбу. Арганізацыя ўжо адправіла на астравы груз гуманітарнай дапамогі, у прыватнасці больш за 15 тысяч набораў гатовай ежы, а таксама генератары электраэнергіі і абсталяванне для сувязі.

### Навукоўцы адзначаюць, што антыбіётыкі становяцца бескарыснымі



Брытанскае ўрадавае агенцтва Public Health England (PHE) апасаецца, што антыбіётыкі хутка стануць бескарыснымі. Гэта можа здарыцца, калі колькасць рэзістэнтных бактэрый у асяроддзі перавысіць пэўны ўзровень. Адна з галоўных задач аховы здароўя сёння — прадухіліць распаўсюджванне «супербактэрый» з супраціўляльнасцю да антыбіётыкаў, лічаць медыкі. Наступствы распаўсюджвання ўстойлівых да антыбіётыкаў бактэрый могуць быць катастрафічнымі, адзначаюць у арганізацыі. Па статыстыцы, сёння ад хвароб, выкліканых рэзістэнтнымі бактэрыямі, штогод памірае каля 700 тысяч чалавек. Да 2050 года, па прагнозах медыкаў, колькасць ахвяр такіх захворванняў дасягне 10 мільёнаў чалавек.

Блізкая ўлада

## АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ І ІХ РАШЭННІ

**У гэтую суботу, 14 верасня, у аблвыканкамах і Мінскім гарвыканкаме пройдуць традыцыйныя прамыя лініі прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання з насельніцтвам. З 9.00 да 12.00 на сувязі будуць:**

- намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ (8 016 221 31 21);
- кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ (8 021 222 22 22);
- кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ (8 023 233 12 37);
- намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК (8 015 273 56 44);
- намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК (8 017 500 41 60);
- намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР (8 022 250 18 69);
- намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ (8 017 222 44 44).

Сугучча

# Мост з тысяч слоў

**Дзесяць маладых аўтараў з Беларусі і Расіі сталі лаўрэатамі чацвёртага конкурсу маладых літаратараў Саюзнай дзяржавы «Мост дружбы». Цырымонія ўзнагароджання прайшла ў Мінску ў Нацыянальным мастацкім музеі.**

Упершыню творчы праект, заснаваны Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы ў мэтах пошуку і падтрымкі таленавітых аўтараў, адкрыцця новых імёнаў у літаратуры і ўмацавання беларуска-расійскіх культурных сувязяў, адбыўся ў 2012 годзе і з таго часу раз на два гады прапануе аўтарам-пачаткоўцам ва ўзросце 18—30 гадоў паспрабаваць творчыя сілы ў малых літаратурных формах (апавяданне, эсэ, навела, нарыс).

**Міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** падкрэсліў на цырымоніі ўзнагароджання, што арганізатары вызначылі для конкурсу менавіта жанр апавядання — мабыць, самы складаны жанр у мастацкай прозе: «Я веру ў тое, што па гэтых апавяданнях наступныя пакаленні будуць разглядаць наш час, успрымаючы яго і ў мастацкім, і ў дакументальным фармаце». Ён адзначыў, што маладыя аўтары тонка адчуваюць час, глыбока ведаюць прадмет, пра які пішуць, — таму некаторыя з іх перамагаюць ужо неаднойчы.

Наогул гэтым разам на конкурс паступіла больш за 70 твораў з розных рэгіёнаў Беларусі і Расіі — ад Брэста да Далёкага Усходу, а пасля папярэдняга адбору на суд экспертнай рады было вынесена 60 работ. З іх пасля дэталёвага абмеркавання журы вызначыла дзесяць найлепшых — па пяць маладых аўтараў ад кожнай краіны. Лаўрэатамі конкурсу ад Беларусі сталі Алена Папко (твор «Вясёлка»), Андрэй Кулеш («Моцю»), Юлія Шурбіна («Ванільнае пячэнне»), Карына Ломцева-Пашкевіч («Жамчужнае вяселле»), Анастасія Бакуновіч («Нявеста»), ад Расіі — Дзмітрый Лагуцін («Мая Японія»), Віктар Чыгір («Метамарфозы»), Кацярына Капыткова («Дажыць да сваёй смерці»), Аліна Асокіна («Да першага снегу») і Яна Паўлава («Датычнасць»). Творы ўсіх лаўрэатаў па традыцыі друкуюцца ў адмысловым альманаху і такім чынам знаходзяць новых чытачоў.

**Намеснік дырэктара Інстытута сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага РАН Дар'я МАСКОЎСКАЯ**, якая ўваходзіла сёлета ў журы зазначыла, што многія конкурсныя творы ўразілі яе глыбінёй і высокім узроўнем майстэрства: «Я стаўлюся да гэтых першых крокаў нашых удзельнікаў як да перадгісторыі, авантэкстаў будучых вялікіх пісьменнікаў і мяркую, што праз пэўны час мы будзем беражліва захоўваць гэтыя дэбютныя работы ў архівах і перагортваць у пальчатках».

Лаўрэаты ж, выказваючы падзяку суддзям, прызнаваліся, што конкурс дазволіў ім адчуць сябе часткай маштабнага працэсу культурнага ўзаемадзеяння дзвюх краін, якія, нібыта два берагі ракі, аб'ядноўвае «Мост дружбы». «Дзякуй, што даяце нам, маладым, быць пачутымі, бо гэта вялікі стымул для развіцця», — падкрэсліла тройчы лаўрэатка конкурсу Алена Папко. Пісьменніца прызналася: крыху шкадуе пра тое, што налета ўжо не зможа зноў ступіць на «Мост дружбы», бо не трапіць на конкурс па ўзросце, але шчыра пажадала іншым поспехаў у творчым спаборніцтве і адкрыцця ўсё новых цікавых імёнаў у сучаснай літаратуры. Што да ўласнага сакрэту поспеху, то Алена сцвярджае: «Для мяне сама гэта кожны раз прыемная нечаканасць, бо ўсе апавяданні, якія ўваходзілі ў лік прызёраў, вельмі розныя. Першае з іх, «Ваўчыца», я напісала пад уражаннем ад наведвання Белавежскай пушчы, другое было крыху містычнае, прысвечанае Косаўскаму замку, — даведаўшыся пра яго гісторыю, я вельмі перажывала, што мы не можам зберагчы сваю багатую спадчыну, і паспрабавала «адрадзіць» замак хоць у сваім творы; нарэшце, цяперашняе апавяданне «Вясёлка» звязанае з маімі студэнцкімі гадамі і з Брэстам — гэта мой падарунак гораду. Ёсць задумка неўзабаве выдаць кнігу паэзіі, якая ўжо даўно выспявае, і — працаваць далей у рэчышчы літаратуры, расці і развівацца».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# Восень бярэ верх

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння летняе надвор'е адыграе апошні акорд. Вобласць павышанага атмасфернага ціску пачне здаваць свае пазіцыі ў другой палове дня, калі да паўночна-заходніх межаў падыдзе франтальны падзел. Там чакаюцца невялікія дажджы, на астатняй тэрыторыі ападкаў не будзе. Удзень паветра прагрэецца ад 17 да 25 градусаў цяпла.

І ўжо ў суботу абстаноўка істотна пераменіцца. На поўначы Атлантыкі ўтварыўся цыклон. Халодны фронт ад яго і прынясе нам восень. Хоць дажджы пройдуць уначы — месцамі, а ўдзень — толькі па паўночным усходзе, камфорту стане прыкметна меней. Вецер будзе заходні і паўночна-заходні парывісты, у асобных раёнах — да моцнага. Слупок тэрмометра адчувальна пойдзе ўніз. Уначы чакаецца ад 7 да 12 са знакам «плюс», а вось удзень толькі 13—20.

У нядзелю ж фронт набярэ сілу. Чакаецца воблачнае надвор'е. Дажджы, як і ў суботу, пройдуць пераважна па паўночным усходзе, паветра працягне яшчэ мацней выхалоджвацца — уначы будзе ўсяго 3–9 цяпла. Удзень жа роскід тэмператур будзе даволі істотны: ад 10 градусаў цяпла па поўначы да цалкам камфортных 22 у паўднёва-заходніх раёнах. Вось так лета фактычна без бою здасць свае пазіцыі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# Актыўныя, прыгожыя, цікавыя...

## «Энергія ўзросту» паказала, якім можа быць жыццё на пенсіі

**«Цяпер ва ўсім свеце думаюць, як падоўжыць актыўнае даўгалецце. Нам чакаць няма калі. Дэвіз нашага фэстывалю — пакуль іншыя плануюць, мы ўжо робім!» — гэтымі словамі ў пачатку верасня пад Мінскам адкрыўся міжнародны фестываль «Энергія ўзросту», на які з'ехаліся прадстаўнікі Латвіі, Украіны, Расіі і Беларусі.**

Сучасныя людзі сярэбранага веку разбіваюць многія стэрэатыпы — прызнаемся, нават пісаць пра гэта ўжо стала стэрэатыпам. І тым не менш... Думаеце, пенсія і мода маласумяшчальныя? А як наконт моды на здароўе? А якое здароўе можа быць без фізічнай актыўнасці? На фестывалі можна было паўдзельнічаць у рознага кшталту майстар-класах. Напрыклад, па спартыўным арыентаванні і арыент-шоу. Святлана Атамановіч — настаўніца матэматыкі вышэйшай катэгорыі, у якой, акрамя педагагічнай дзейнасці, ужо шмат гадоў ёсць хобі. Пачынаючы з 1986 года яна праводзіць палатачныя летнікі, дзе штогод адпачывае да сотні дзяцей і іх бацькоў. Яна вадзіла ў пешыя паходы ў Саяны і на Камчатку, а пачынаючы з 1996 года кожнае лета арганізуе байдарачныя паходы па азёрах і рэках Беларусі.

* * *

Пенсійны ўзрост: працаваць ці не? Як знайсці работу, калі вам гэта патрэбна? Сваім вопытам па навучанні і перанавучанні людзей старэйшага ўзросту падзяліліся спецыялісты сеткі аптэк ADEL. Ды і ў цэлым, на адным з круглых сталоў, арганізаваных на фестывалі, паднялі пытанні працаўладкавання людзей старэйшага ўзросту ў Беларусі, у тым ліку пагаварылі і пра дыскрымінацыю па ўзросце — эйджызм на рабочых месцах.

**Арганізатары фестывалю — грамадская арганізацыя «Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў» і турыстычная кампанія «Бенефіс-Тур».**

Усё больш людзей цяпер спрабуюць зарабіць у інтэрнэце. Гэтаму быў прысвечаны майстар-клас Ірыны Каска «Школа стабільнага заробку на Facebook». Ірына Каска прыехала з Наваполацка, яна 20 гадоў працавала начальнікам сектара маркетынгавых даследаванняў на ААТ «Нафтан», а цяпер — трэнер па прасоўванні бізнесаў у сацыяльных сетках, бізнес-трэнер клуба прадпрымальнікаў новага пакалення «Дарога да мільёна». Магчыма, і ўдзельнікаў фестывалю змагла натхніць паспрабаваць сябе на новай ніве.

* * *

Выдаткі на харчаванне — гэта асноўныя траты, якія займаюць ільвіную долю бюджэту пенсіянераў. Таму кулінарная бітва «Халадзільнік пенсіянера — невычэрпная крыніца кулінарнага натхнення», праведзеная Марынай Бандаровіч — брэнд-шэф-поварам, дыеталагам, тэхнолагам харчавання — таксама выклікала немалую цікавасць усіх прысутных. За 20 хвілін камандам трэба было зрабіць з вельмі сціплага набору прадуктаў кулінарныя стравы. І яны справіліся — стварылі сапраўдныя шэдэўры, не толькі смачныя, але і карысныя, а яшчэ — прыгожыя!






І зноў вернемся да моды. Не так ужо да яе і абыякавыя сучасныя людзі на пенсіі, ва ўсякім разе, тыя, каму сугучныя гэтыя словы — энергія ўзросту. Бо, як сказаў першы намеснік старшыні Беларускага рэспубліканскага геранталагічнага грамадскага аб'яднання, доктар медыцынскіх навук, прафесар Кірыл Прашчаеў: «За гады работы геранталагам я пераканаўся: узрост чалавека не мае значэння. Ён павінен перастаць быць аб'ектам спекуляцый і маніпуляцый і стаць падставай для гонару». А калі ўзрост — падстава для гонару, то чаму б яму не быць прыгожым? На модным паказе ад мадэльнай школы Цэнтра актыўнага даўгалецця мадэлі ўзросту 60+ прадэманстравалі, што прыгожай і стыльнай жанчына можа быць на любым этапе свайго жыцця. І натхнілі сваім прыкладам далёка не адну з гасцей фестывалю!

А парфумерны стыліст Вольга Азізава на сваім майстар-класе «Мая задача — мой водар — маё рашэнне» паказала, як з дапамогай водараў можна ўзмацніць жаноцкасць («Чаму б і не? Хай вам хоць 100+, жанчына застаецца жанчынай», — лічыць Вольга Азізава). А яшчэ — адчуваць сябе бадзёра на працягу дня, супакоіць нервы, адрадзіць пагаслыя пачуцці, наладзіць адносіны з дзецьмі... Ва ўсім гэтым аказваецца, могуць дапамагчы правільныя водары.

А яшчэ на фестывалі можна было павучыцца танцаваць зумбу і аргенцінскае танга, пагаварыць пра антыўзроставую тэрапію і валанцёрства, пазнаёміцца з рэабілітацыйнай карэкцыйнай лячэбнай праграмай для суставаў і пазваночніка (лячэбным комплексам на аснове пілатэсу, ёгі, кітайскай гімнастыкі і дыхання), навучыцца рабіць лялькуабярэг, абмяняцца вопытам сваіх падарожжаў...

Фестываль «Энергія ўзросту» быў да краёў напоўнены цікавымі сустрэчамі, лекцыямі, майстар-класамі, танцамі і канцэртамі. Мерапрыемствы падобнага роду і такога ўзроўню ў нас прайшлі фактычна ўпершыню, але яно ўдалося. А арганізатары ўжо задумаліся пра наступны фестываль.

**Святлана БУСЬКО.**

# СТАРЭННЕ — НЕ ПАГРОЗА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Яна падкрэсліла, што ў краіне шмат прававых інструментаў для падтрымкі пажылых людзей — у галіне аховы здароўя, сацыяльнай сферы і пенсійнага забеспячэння. Тым не менш для аб'яднання намаганняў пад эгідай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны створана рабочая група з 35 спецыялістаў, якая працуе над новым дакументам — Нацыянальнай стратэгіяй дзеяння ў інтарэсах пажылых людзей. У кастрычніку — лістападзе бягучага года практ паступіць на абмеркаванне.

Як некаторыя з новых ініцыятыў ужо рэалізуюцца ў сталіцы, расказала **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына ДУДКА.** У Мінску жыве 419,4 тысячы пенсіянераў, гэта значыць кожны чацвёрты. З іх 35 % (больш за 169 тысяч) працягвае працаваць. Пры гэтым ва ўзросце ад 70 да 79 гадоў працуе больш за 17,2 тысячы чалавек, ва ўзросце ад 80 да 89 гадоў — 863 чалавекі, і 16 мінчан працягваюць працаваць ва ўзросце больш за 90 гадоў. Пераважная большасць з іх занята ў сферы адукацыі — гэта выкладчыкі ВНУ і іншых навучальных устаноў. Дарэчы, у такіх сталых гадах у Мінску 6,5 тысячы жыхароў. А тых, хто перасягнуў стогадовы рубеж, — 67 чалавек, прычым сярод іх усяго пяць мужчын, астатнія жанчыны.

— Мы ўкараняем новыя формы сацыяльнага абслугоўвання, каб пажылыя людзі маглі як мага даўжэй самастойна сябе абслугоўваць і жыць дома. Найперш гэта сэрвісы па дастаўцы і забеспячэнні неабходнымі прадуктамі і прадметамі. Для тых пенсіянераў, якія не працуюць, на базе тэрытарыяльных цэнтраў створаны аддзяленні дзённага знаходжання, дзе функцыянуюць гурткі і клубы па інтарэсах. Не першы год мінчане ва ўзросце 60+ вучацца ва ўніверсітэце трэцяга ўзросту, і ён карыстаецца вялікай папулярнасцю, — пералічвае Ірына Дудка. — Асаблівую цікавасць выклікаюць мерапрыемствы па здаровым ладзе жыцця. Вясной і летам мінчане з задавальненнем займаюцца ёгай, скандынаўскай хадой у тым жа Лошыцкім парку.

## У СТАРАСЦІ ЖАНОЧАЕ АБЛІЧЧА

На стане здароўя пажылога чалавека, ад якога залежыць яго сацыяльная актыўнасць, засяродзіла ўвагу **намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага клінічнага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны імя П. М. Машэрава, кіраўнік Рэспубліканскага геранталагічнага цэнтра (актыўнага даўгалецця), галоўны пазаштатны спецыяліст па геранталогіі Міністэрства аховы здароўя Людміла ЖЫЛЕВІЧ:**

— Каля 98 % пажылых людзей знаходзіцца на дыспансерным уліку ва ўрачоў розных спецыяльнасцяў. Наладжана ў нас сістэма інтэграванай дапамогі — медыкасацыяльнай і паліятыўнай. У краіне працуе 103 бальніцы сястрынскага догляду, у кожнай вобласці ёсць хоспіс. А валанцёрства такіх жа пажылых людзей — гэта так званая сацыяльная матывацыя, прыклад іх падапечным, што трэба жыць і спраўляцца, нягледзячы на хваробы.

Пакуль у нашай краіне старасць мае жаночае аблічча. А розніца ў працягласці жыцця мужчын і жанчын складае 10 гадоў.

— На адзнацы ў 65 гадоў мы губляем 40 % мужчын. Жанчына застаецца адна. А адзінота ў пажылым узросце — той фактар, які ўплывае на паталагічнае старэнне. Таму геранталагічная служба шукае шляхі, якія дазволяць вырашыць гэтыя праблемы, найперш падоўжыць працягласць жыцця моцнай паловы, — падкрэсліла Людміла Жылевіч.

**Генеральны сакратар Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа Вольга МЫЧКО** расказала пра адну з цікавых ініцыятыў, якая была падгледжана ў Сінгапуры і рэалізавана ў Партызанскім раёне сталіцы. Тут арганізаваны парк для пажылых людзей, дзе яны могуць пасадзіць агародніну ці кветкі, прагуляцца па дарожках, заняцца скандынаўскай хадой ці іншымі відамі актыўнасці. У планах Чырвонага Крыжа — стварэнне пункта абмену сродкамі рэабілітацыі, дзе можна будзе атрымаць функцыянальны ложак, хадункі і іншыя прыстасаванні.

## СКАНДЫНАЎСКАЯ ХАДА, АРТ-ТЭРАПІЯ І ВАКАЛ

Цікавыя праекты рэалізуюцца і ў маленькіх гарадах. ПРААН у Беларусі арганізаваў шэраг мясцовых ініцыятыў, накіраваных на прасоўванне здаровага ладу жыцця і павышэнне фізічнай актыўнасці сярод пажылых людзей, а таксама навучанне карысным навыкам. У Жабінкаўскім раёне правялі майстар-класы па скандынаўскай хадзе, лыжах і інклюзіўнай гімнастыцы. Іх прайшлі 250 пенсіянераў, 75 % з якіх змаглі павысіць узровень фізічнай актыўнасці.

— У нас ёсць выдатныя прыклады — 74-гадовы Валерый Казакоў, былы ваенны, перанёс інсульт. Апошнія гады ён не пакідаў межы свайго двара, а цяпер заахвоціўся скандынаўскай хадой і рэгулярна займаецца. Сцвярджае, што яго стан здароўя істотна палепшыўся, — расказвае **супрацоўнік па камунікацыі і прасоўванні ПРААН у Беларусі Аляксей ЧЫСТАДАРСКІ.**

У Смаргонскім раёне была арганізавана школа здароўя, дзе пад кіраўніцтвам тэрапеўтаў 600 пенсіянераў атрымалі навыкі вымярэння артэрыяльнага ціску і ўзроўню цукру ў крыві, а таксама здаровага харчавання. У Пружанскім раёне адкрылі камп'ютарны клас, дзе сталыя людзі вучыліся кантактаванню з дапамогай анлайн-сэрвісаў, дзейнічалі школа прыгажосці і здароўя і клас вакалу. У розных мерапрыемствах паўдзельнічала восем тысяч чалавек. У Бярозаўскім раёне быў адкрыты цэнтр псіхалагічнай разгрузкі. Пажылыя людзі маглі атрымаць кансультацыю псіхолага і прыняць удзел у рабоце гуртка арт-тэрапіі і кіно.

У сталіцы ж з кастрычніка да мая 80 жанчын прайшлі навучанне ў школе стылю, дзе не толькі даведаліся пра сакрэты ідэальнага знешняга выгляду, але і атрымалі навыкі пазіравання і выбару аксесуараў. Заняткі праходзілі пры ўніверсітэце трэцяга ўзросту, праект атрымаў працяг у Слоніме, Бабруйску і Пінску.

**Алена КРАВЕЦ.**




## ТАНЦУЙ... Пакуль не замужам?

Санаторый, у які я прыехала падлячыцца, знаходзіўся ў маленькім літоўскім гарадку — чысценькім, дагледжаным. Азёр побач з ім не было, але побач нёс свае воды наш бацька Нёман. Летам ён прывабіў бы шмат народу, пераважна маладога, ахвочага пакупацца, а тады быў сакавік, «не сезон», ды і люд у санаторыі досыць сталага ўзросту. Днём, як водзіцца, мы хадзілі на розныя працэдуры, наведвалі дактароў, а па вечарах пачыналася так званая культурная праграма: нехта ішоў гуляць па беразе Нёмана, нехта — у кіно ці на танцы. Ну сапраўды, які сэнс аднаму, як той ёлупень, сядзець у пакоі, калі можна (дай бог у добрай кампаніі) некуды схадзіць — на людзей паглядзець і сябе паказаць, паслухаць, што называецца, жывую музыку, «адарвацца» ў скоках...

У той вечар мне пашчасціла: у клуб збіралася мая суседка Таццяна, запрашала на танцы і мяне.

Прыйшлі. Народу, бачым, процьма. Жанчыны ўсе расфуфыраныя, з прычоскамі, з манікюрамі. Ну хто ж не хоча выглядаць маладзей, чым напісана ў пашпарце? Да таго ж там, дзе іграе духавы аркестр, дзе ўзросту твайго ніхто не ведае?

Факт, што дамы былі пры парадзе. А вось кавалеры...

Як мне здаецца, яны не ўмеюць выглядаць маладзейшымі. У большасці спіны сагнуліся, жываты адвіслі, разумныя валасы даўно пакінулі галовы (не будзем удакладняць якія і з якіх прычын)... На такіх «малайцоў» паглядзіш, — міжволі падумаеш, што ім, можа, лепш было б у даміно пагуляць альбо ў падкіднога, а яны вось па клубе — ад жанчыны да жанчыны. Заручальныя пярсцёнкі паздымалі і ўсе ўжо «нежанатыя», усе, як быццам, жаніхі ды танцоры, бо дзе ж яшчэ ўспамянуць маладосць, як не на курорце?

Да таго ж і ў люстэркі яны глядзяць хіба пры галенні, то-бок цалкам, як правіла, сябе не бачаць... А душа — яна ж заўжды маладая. Ды і ў народзе кажуць, што калі мужчына крыху прыгажэйшы за чорта, то ўжо і красунчык. Калі ж да таго і трохі манер...

Іншымі словамі стараліся «хлопцы»: досыць галантна запрашалі жанчын на танцы (нас з суседкай таксама) — з некім знаёміліся, заводзілі размовы... Таню адзін кавалер аж тройчы запрашаў. Што і не дзіва! Жанчыне ўсяго трыццаць пяць. У санаторый першы раз прыехала. А тут і кампанія, і жывая музыка, і танцы... Вочкі так і гараць, бо ўсё ў навіну, цікава!

Вяртаецца вось пасля добрага вальса — шчаслівая, пачырванелая — і кажа мне:

— Ведаеце, а там у куце, у натоўпе мужчын, адзін чалавек мільгануў... Якраз як мой муж... У яго, дарэчы, і кашуля такая ж ёсць — блакітная. Летась на дзень салдата дарылі.

Я стала ўзірацца ў кут, дзе стаялі мужчыны, шукаючы «патрэбную» кашулю... Таню тым часам зноў запрасілі на танец.

Аднак адыйсці ад сцэны яна не паспела, бо з натоўпу мужчын «вынырнуў» адзін (досыць прыгожы, у блакітнай кашулі), хуткім крокам рушыў насустрач.

— Дык вось як ты лечышся? — грозна прамовіў ён. — Мне ж пра гэта казалі... Мяне папярэджвалі... А я, дурань, верыць не хацеў: адпусціў цябе... А ну марш дамоў!

Мужчына рашуча «адцягнуў» Таццяну ад партнёра і як малую, за руку, павёў на выхад.

...Калі я вярнулася ў пакой, суседкі і след прастыў. А шкада: яна так рада была свайму водпуску (два гады, казала, з работы не адпускалі!), так хацела адпачыць ад усяго, ад хатніх спраў, пабыць проста жанчынай.

І не прывялося.

**З. М. Наваенка,**
*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

## ПАЭЗІЯ і проза жыцця

Людзі кажуць, што ў першы дзень — госць золата, у другі — серабро, а ў трэці — медзь: дадому едзь.

Танечка, пляменніца майго мужа з Бранска, гасціла ў нас амаль тры тыдні, і за гэты час мы ніколькі не стаміліся. Хутчэй наадварот: нагаварыліся, нагуляліся, разам напрацаваліся, назбіралі трохі ягад ды грыбоў...

І пасмяяцца мелі з чаго. Ну, уявіце: у нас на дачы (няёмка і прызнавацца), як толькі прыехала госця, стала прападаць... туалетная папера. Некалькі дзён мы з мужам губляліся ў здагадках, пакуль не даведаліся, што на рабоце ў нашай Танечкі ў гэты маленькі дамок кожны ходзіць са сваёй... А потым — адпаведна — забірае. Прывычка... І яна ўжо настолькі ў крыві, што нават у гасцях і ў час адпачынку Таня з рулонам пад пахай магла з'явіцца і на гародзе, і на кухні, і на канапе ля тэлевізара...

Карацей, насмяшыла нас, а як мяне дык вярнула ў мінулае, у часы татальнага дэфіцыту на ўсё.

...Якраз тады, помню, я аддавала замуж сваю сяброўку. Вяселля маладыя зусім не хацелі, а паколькі бацькі настойвалі, згадзіліся на больш чым сціплы варыянт. Маўляў, у загс яны пойдуць пехатой, распішуцца. Госці з найбліжэйшай радні і купкі сяброў пачакаюць іх дома ў нявесты...

І вось у прызначаны час сталы ўжо накрытыя, госці пазіраюць на іх, як той кот на каўбасы, аднак нешта выпіць ці з'есці ўсё не выпадае, бо мінула гадзіна, пайшла другая, а маладых усё няма і няма. Маці іх ужо ледзь не плачуць («Нешта зрабілася!»), ба́цькі — абодва — кураць папяросу за папяросай, а мы, госці, уголас перабіраем усе магчымыя варыянты затрымкі ды спрабуем іх суцяшаць.

Урэшце нехта ўжо збіраецца званіць — спачатку ў загс, а потым і ў міліцыю, але ж не паспявае, бо шчаслівыя маладажоны з'яўляюцца на гарызонце. Нявеста (гэта і сёння перад вачыма!) — танютка, прыгожая, з букетам гэткіх жа незабыўна пяшчотных руж і жаніх — усмешлівы, дужы, з «абоймай»... туалетнай паперы.

Усё аказалася больш чым проста. Шлях гэтай новаспечанай сям'і пралягаў каля сталічнага ЦУМа, дзе ў канцы кожнага месяца (не кажучы пра год і квартал) у продаж выкідвалі нейкі дэфіцыт.

Вось і тады чэргаў было некалькі, нават на вуліцы каля ўсіх дзвярэй... І тая, за туалетнай паперай, здалася маладым зусім нядоўгай. Да таго ж на рукі давалі па дзесяць рулонаў, а яны былі ўдваіх, значыць, купіць маглі цэлых дваццаць і такім чынам распачаць сумесныя сямейныя будні.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, заключить договор купли-продажи не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам торгов. Срок оплаты предмета торгов: по условиям договора купли-продажи, но не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность в городе Щучине и в Щучинском районе

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта в Щучинском районе | Площадь земельного участка, га | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок | Город Щучин, улица Батырева, 11 | 0,1132 | 425850100001000427 | 2 191,57 | 7 471,20 | 747,12 |
| 2 | Земельный участок | Город Щучин, улица И. Мележа, 30 | 0,1500 | 425850100004000154 | 51,06 | 8 610,0 | 861,0 |
| 3 | Земельный участок | Орлевский сельсовет, д. Турейск, 44А | 0,1057 | 425885309614000018 | 1 811,12 | 317,10 | 31,71 |
| 4 | Земельный участок | Орлевский сельсовет, д. Турейск, 49А | 0,1502 | 425885309614000016 | 1 191,05 | 450,60 | 45,06 |

Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Наличие возможности подключения к линии электроснабжения и газоснабжения по лоту № 1 и 2.

Наличие возможности подключения к линии электроснабжения по лотам № 3 и 4.

Аукцион состоится **15 октября 2019** г. в **12.30** по адресу: 231513, г. Щучин, пл. Свободы, 11 (здание Дома Советов, 2-й этаж, малый зал районного Совета Депутатов).

Заключительная регистрация участников аукциона: **15 октября 2019 г. с 8.00 до 12.00**.

1. Организатор аукциона – Щучинский районный исполнительный комитет, г. Щучин, пл. Свободы, 11.

Контактные телефоны комиссии: председатель **801514 2 70 44**, заместитель председателя и секретарь **801514 2 81 52**.

2. Прием заявлений и прилагаемых документов на участие в аукционе производится с **14 сентября 2019 г. по 9 октября 2019 г. включительно** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в рабочие дни, кабинет 54 отдела землеустройства райисполкома.

3. Для участия в аукционе гражданин, юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые они желают приобрести в частную собственность, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключают с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении, а также заключившие соглашение.

Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

4. **Сумма задатка перечисляется на расчетный счет организатора аукциона** BY29AKBB36045270000164000000 ЦБУ № 424 филиала № 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY21400, г. Щучин, **получатель — Щучинский районный исполнительный комитет, УНП 500066573.**

5. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся внести плату за выкуп земельного участка в частную собственность и возместить затраты, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи, а также с условиями, предъявляемыми к проектным решениям зданий и сооружений, которые будут размещаться на предоставляемых земельных участках.

7. Победителю аукциона или единственному участнику несостоявшегося аукциона может быть предоставлена рассрочка внесения платы, согласно действующему законодательству

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Самай галоўнай задачай тыдня будзе здабыццё важных дзелавых сувязяў і атрыманне дакладнай інфармацыі. У сераду лепш заняцца завяршэннем нясконачных спраў, асабліва дробных. У чацвер будзе шмат нарад і папяровай работы. У пятніцу не давярайце выпадковым знаёмствам і будзьце асцярожныя пры зносінах з даўно знаёмымі людзьмі, у гэты дзень ёсць верагоднасць разрыву адносін з-за прынцыповасці партнёра.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні вам спатрэбяцца хуткасць прыняцця і ажыццяўлення рашэнняў, унутраны спакой і цягавітасць. Чым больш папрацуеце ў аўторак, тым больш атрымаеце прыбытку. А вось у чацвер лепш не мітусіцца і не пачынаць нічога новага. У пятніцу старайцеся не ціснуць на навакольных, бо яны ў гэты дзень будуць крыўдлівыя і не схільныя выконваць вашы патрабаванні. У суботу не адмаўляйцеся ад запрашэння: магчыма, менавіта сябры дапамогуць слушнай парадай.

**БЛІЗНЯТЫ.** Вы можаце шмат чаго дасягнуць і атрымаць тое, чаго так даўно хацелі. Усё, што для гэтага трэба, — верыць у сябе і ў поспех. У сярэдзіне тыдня вас можа закруціць віхор цікавых спраў, сяброўскіх сустрэч і любоўных спатканняў. І вы адчуеце паўнату і радасць жыцця.

**РАК.** Тыдзень будзе спрыяльны для вырашэння прафесійных задач. Вы поўныя сіл і энергіі, а інтуіцыя падказвае выключна правільныя рашэнні. Можаце зрабіць бліскучую кар'еру, калі праявіце мэтанакіраванасць і ўпэўненасць у дасягненні пастаўленых задач. Вашы таленты, у тым ліку дыпламатычнасць, дазваляюць атрымаць неабходную інфармацыю і дамовіцца з патрэбнымі людзьмі.

**ЛЕЎ.** Паспрабуйце акрэсліць дакладны план на тыдзень. Абараніце сябе ад непатрэбных сустрэч і кантактаў, яны не прынясуць нічога, акрамя расчаравання і пустога марнавання часу. Крытычна паглядзіце на свае ідэі, наколькі яны рэалістычныя і ці магчыма ўвасабленне іх у рэальнае жыццё. Успомніце пра сям'ю і дзяцей, аддайце ім неабходную ўвагу.

**ДЗЕВА.** Давядзецца шмат працаваць, браць ініцыятыву ў свае рукі. І не чакаць ні пахвалы, ні прэміі. Уважліва вывучайце інфармацыю, якая будзе паступаць да вас на працягу тыдня на рабоце, зрабіце з яе важныя высновы. Галоўнае для вас — гэта не прагледзець сапраўды перспектыўныя справы. У выхадныя не варта хаваць сябе дома, ёсць добры шанц пашырыць кола карысных знаёмстваў.

**ШАЛІ.** У пачатку тыдня вам, падобна, захочацца задумаць штосьці новае і дамагчыся жаданага самымі экстравагантнымі спосабамі. Не бойцеся рызыкаваць. Толькі не цягніце час, бо другая палова тыдня не схіляе да такіх дзеянняў. Вы зможаце дакладна ўсвядоміць, што перашкаджае вашаму духоўнаму росту і развіццю, гэта дасць магчымасць пачаць карэкцыю негатыўных рыс характару.

**СКАРПІЁН.** Вас чакае поспех на рабоце і прыемныя перамены ў асабістым жыцці. Вы зможаце стаць лідарам і арганізатарам. Да невялікіх перашкод пастаўцеся па-філасофску, і вы хутка іх пераадолееце, атрымаўшы важны вопыт.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні верагодная рэзкая змена дзейнасці. Пры гэтым неабавязковая змена работы, проста з'явіцца іншая тэма ці нават цэлы кірунак. У канцы тыдня замест напружання прыйдзе лёгкасць, у справах адкрыецца другое дыханне. У выхадныя дні могуць раскрыцца таямніцы вашага даўняга мінулага.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні пажадана заняцца засваеннем чаго-небудзь новага, гэта дазволіць пашырыць кругагляд. Не бойцеся праявіць адкрытасць і прыняць, быць можа, не зусім традыцыйны пункт гледжання. Ні да якіх негатыўных наступстваў гэта не прывядзе, вам будзе лягчэй мець зносіны з самымі рознымі людзьмі. Час адмовіцца ад забабонаў.

**ВАДАЛІЎ.** Будзеце падсвядома імкнуцца да ўдзелу ў разнастайных авантурах. Невядома, ці будзе гэтая рызыкоўная дзейнасць апраўданая дасягненнем важнай мэты, аднак бура незабыўных перажыванняў гарантаваная. Чаму б і не атрымаць новыя ўражанні? У сярэдзіне тыдня не чакайце выканання ўсіх планаў, некаторыя з іх хоць і рэалізуюцца, але з шэрагам паправак. У чацвер вы будзеце здольныя згладзіць практычна любыя канфліктныя сітуацыі на рабоце. Сямейныя спрэчкі на адцягненыя тэмы ў суботу могуць стаць нагодай для эмацыянальных.

**РЫБЫ.** У першай палове тыдня вас можа цягнуць на неабдуманыя ўчынкі. Паспрабуйце ўсё ж пазбегнуць рызыкі, яна не апраўдае вашых душэўных і матэрыяльных выдаткаў. Сярэдзіна тыдня патрабуе прынесці змены ў асабістым жыцці, хоць прычынай не самыя прыемныя. Не спяшайцеся рваць адносіны і збіраць крыўды. А вось на рабоце ваш аўтарытэт умацуецца. У чацвер усе рашэнні варта прымаць самастойна. У суботу зрабіце сабе маленькае свята, у гэты дзень вы зможаце павесяліцца ад душы.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.38 | 19.32 | 12.54 |
| Віцебск — | 6.26 | 19.23 | 12.57 |
| Магілёў — | 6.28 | 19.22 | 12.54 |
| Гомель — | 6.26 | 19.17 | 12.51 |
| Гродна — | 6.54 | 19.47 | 12.53 |
| Брэст — | 6.56 | 19.46 | 12.50 |

### Месяц

*Першая квадра 6 верасня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

**Пр.** *Генадзя, Купрыяна, Міхаіла.*
**К.** *Яўгеніі, Гвідона, Філіпа, Яна.*



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

## ЗАЎТРА




...у суседзяў




## Даты | Падзеі | Людзі

### 13 ВЕРАСНЯ

**У краіне**

**1854** год — нарадзіўся (вёска Крываносы, цяпер у Астравецкім раёне) Напалеон Восіпавіч Цыбульскі, беларускі і польскі фізіёлаг, філосаф, грамадскі дзеяч, доктар медыцыны. У 1880 годзе скончыў Пецярбургскую ваенна-медыцынскую акадэмію. З 1885-га — у Польшчы. Працаваў у галіне фізіялогіі ў Ягелонскім універсітэце (г. Кракаў); загадчык кафедры, дэкан, рэктар. Член АН Польшчы. Адзін з першых выкарыстаў унутрывенныя ўліванні салевых раствораў. У Кракаве стварыў медыцынска-навуковую школу. Адкрыў уласцівасці адрэналіну, вывучаў гіпноз. Памёр у 1919 годзе.

**1911** год — нарадзіўся Юлій Таўбін, беларускі паэт. Аўтар зборнікаў паэзіі «Агні», «Мая другая кніга», паэмы «Таўрыда» і іншых. Член БелАПП. У 1933 годзе рэпрэсаваны, сасланы ў Цюмень. Настойліва вывучаў англійскую мову, многа перакладаў з яе. Таксама перакладаў на беларускую мову творы Г. Гейне, У. Маякоўскага, А. Чэхава. У 1937 годзе зноў арыштаваны, і 29 кастрычніка выязная сесія ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР асудзіла паэта да расстрэлу. Расстраляны наступнай ноччу ў Мінску. Па абедзвюх справах рэабілітаваны — у 1956 і 1957 гадах.



**1974** год — выйшла ў эфір першая каляровая перадача Беларускай рэспубліканскай студыі тэлебачання.

**2002** год — асвячона месца будаўніцтва і закладзены першы камень у падмурак Мінскай гарадской ратушы на плошчы Свабоды, сімвал гістарычнай памяці мінчан. Будынак быў адноўлены ў 2002—2004 гадах.

**У свеце**

**1853** год — нарадзілася Соф'я Львоўна Пяроўская, руская рэвалюцыянерка-народніца, член выканкама «Народнай волі». Мела беларускія карані: маці знакамітай рэвалюцыянеркі, В. С. Весялоўская, родам з Магілёўскай губерні. Арганізатар і ўдзельніца замахаў на Аляксандра ІІ. Вясной 1880 года ўдзельнічала ў падрыхтоўцы замаху на імператара ў Адэсе. У 1881-м кіравала наглядальнымі атрадам, а пасля арышту лідара партыі А. І. Жалябава (свайго грамадзянскага мужа) узначальвае справу і даводзіць яе да канца, асабіста намалявала план расстаноўкі кідальнікаў бомбаў, і ўзмахам белай хусцінкі падала І. Грынявіцкаму сігнал кінуць бомбу. 22 сакавіка 1881 года была апазнана, арыштавана і аддадзена пад суд. 15 красавіка 1881 года разам з А. І. Жалябавым, М. І. Кібальчычам, Ц. М. Міхайлавым і М. І. Рысаковым павешана на пляцы Сямёнаўскага палка. «Мы задумалі вялікую справу. Быць можа, двум пакаленням прыйдзецца палегчы на ёй, але зрабіць яе трэба», — не раскаяўшыся, казала Соф'я Пяроўская на судзе.

**1902** год — у Вялікабрытаніі ўпершыню ў якасці доказу віны падазраванага ва ўчыненні злачынства былі выкарыстаны адбіткі яго пальцаў, выяўленыя на месцы здарэння.

**1924** год — нарадзіўся Марыс Жар, французскі музыкант і кампазітар. Аўтар балетаў «Сабор Парыжскай Божай Маці», «У гонар Айседоры» і іншых. За музыку да кінафільмаў «Лоўрэнс Аравійскі», «Доктар Жывага», «Паездка ў Індыю» быў тройчы ўганараваны прэміяй «Оскар». Памёр у 2009 годзе.

## УСМІХНЕМСЯ

У маё выхаванне бацькі ўклалі шмат сіл, часу і пружкі.

**На калектыўнай тэрапіі.**

**— Добры дзень, мяне завуць Андрэй і я ненавіджу песні Алегравай.**

**Усе:**

**— Прывітанне, Андрэй!**

Бацькоўскія сходы — цікавая рэч.

Увявіце сабе, што вы аддалі аўтамабіль у сэрвіс, а ўсіх кліентаў сэрвісу збіраюць і прапясочваюць, што яны недастаткова часу аддавалі машыне, і што, калі гэта працягнецца, — яны вазіцца з ёй не будуць. Пасля чаго збіраюць грошы звыш прайса.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3127.
Нумар падпісаны ў 19.30 12 верасня 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

13 верасня 2019 г. № 37 (522)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

# «ЕЗДЗІЛІ ПА ЛЕСЕ З МІГАЛКАМІ...»





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Як працуе ўчастковы інспектар у вёсцы, адкуль роўна два гады таму прапаў 10-гадовы Максім Мархалюк

У маёра міліцыі Андрэя БОЛБАТА не самы просты ўчастак. Тут і запаведнікі, і гушчары, і дзікія балоты... Адным словам, Белавежская пушча. Менавіта ў гэтых лясах заблукаў Максім, якога два гады шукала амаль уся краіна. У той час Андрэй Болбат працаваў інспектарам ДАІ і ў ліку першых накіраваўся на яго пошукі.

стар. 4

**Вадзім ІПАТАЎ:**

ВЫБАРЫ-2019

# Аб эвалюцыі выбарчага права і перспектывах электроннага галасавання

**Раней у Беларусі існавалі асобныя законы па кожных выбарах, напрыклад «Аб выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» 1994 года, «Аб выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» 1998 года. Гэта было не зусім зручна, як для выбаршчыкаў, так і для выбаркамаў. Таму быў створаны адзіны акт, які рэгламентуе пытанні правядзення ўсіх відаў выбараў, — Выбарчы кодэкс.**

**Як ён змяніўся за амаль 20 гадоў свайго існавання, ці прыжывуцца ў Беларусі замежныя электаральныя ноу-хау накшталт электроннага галасавання? На гэтыя і іншыя пытанні ў інтэрв'ю карэспандэнту БелТА расказаў дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў (НЦЗПД) Вадзім ІПАТАЎ.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**— Вадзім Дзмітрыевіч, як намеснік старшыні ЦВК і адначасова дырэктар НЦЗПД вы можаце зірнуць на выбарчае заканадаўства з розных пунктаў гледжання. Як бы вы яго ацанілі як практык і як тэарэтык — з пазіцыі заканатворчасці?**

— Лічу, што выбарчае заканадаўства ў нас уяўляе зладжаную, выразна дзейсную сістэму. Так, найбольш важныя пытанні замацаваны ў Канстытуцыі, дзе ім прысвечана цэлая глава. У 2000 годзе быў прыняты Выбарчы кодэкс, які поўна і ўсебакова рэгламентуе ўсе аспекты правядзення выбараў і рэферэндумаў.

стар. 3


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Стратэгія развіцця



Сектару апрацоўчай прамысловасці Брэстчыны трэба аддаць асаблівую ўвагу. стар. 2

### Байцам прысвячаецца...



Пад Гомелем адкрылі памятны знак у гонар адмысловага навучальнага цэнтра. стар. 2

### Паслугі на колах



Як мясцовыя ўлады задавальняюць патрэбы вяскоўцаў у Рагачоўскім раёне. стар. 15

### МАДРа не Мадэра



У Брэсце перамудрылі з назвамі прыпынкаў. стар. 14

### Свята ў хату!



У бліжэйшы ўік-энд Гродна і Мінск запрашаюць на свае дні горада. стар. 16

# Дыялог трэба развіваць

**Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ правёў сустрэчу з намеснікам міністра замежных спраў Балгарыі Петка ДОЙКАВЫМ.**


Фота БелТА.

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента, бакі абмеркавалі пытанні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, а таксама ход падрыхтоўкі візіту парламенцкай дэлегацыі Беларусі на чале са спікерам Савета Рэспублікі ў Балгарыю ў кастрычніку гэтага года.

«Мы надаём вялікае значэнне развіццю сяброўскіх адносін з Балгарыяй», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Ён прапанаваў абмеркаваць магчымасці ўмацавання двухбаковага партнёрства. На думку старшыні Савета Рэспублікі, патэнцыял дзвюх дзяржаў дазваляе гаварыць пра больш цесныя кантакты — палітычныя, гандлёва-эканамічныя, гуманітарныя. «У гэтым плане, мяркую, мы павінны дадаць. Для гэтага ёсць усе падставы, — заявіў ён. — Перш за ўсё, нам трэба актывізаваць кантакты на вышэйшым і высокім узроўнях. Тут ёсць пэўны дэфіцыт, і нам неабходна гэтым сур'ёзна займацца».

Акрамя таго, старшыня Савета Рэспублікі выказаў упэўненасць у магчымасці пашырэння міжпарламенцкага супрацоўніцтва, актывізацыі работы парламенцкіх груп дружбы. «Хацелася б, каб наша дзейнасць напаўнялася канкрэтнымі праектамі і справамі», — дадаў Міхаіл Мясніковіч.

Савет Рэспублікі як Палата рэгіёнаў аддае асаблівую ўвагу развіццю рэгіянальнага супрацоўніцтва. «У нас вельмі шмат дамоў аб дружбе, супрацоўніцтве паміж гарадамі. Мы зацікаўленыя ў тым, каб гэтая работа насіла не дэкларатыўны характар, а была максімальна канкрэтная», — адзначыў ён.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама прапанаваў абмеркаваць пытанні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «Мы маглі б выходзіць на сумесныя кампаніі і ствараць умовы для таго, каб прадстаўнікі бізнесу нашых краін больш актыўна працавалі адзін з адным», — заявіў ён. Міхаіл Мясніковіч прапанаваў балгарскім кампаніям стаць рэзідэнтамі Парка высокіх тэхналогій, а таксама Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Для балгарскага бізнесу супрацоўніцтва з Беларуссю — гэта магчымасць выхаду на перспектыўныя рынкі ЕАЭС, дадаў ён.

Акрамя таго, бакі абмеркавалі магчымасці ўмацавання партнёрства ў галіне адукацыі. Балгарскаму боку прапанавана стварыць адпаведную рабочую групу. На сустрэчы, сярод іншага, ішла гаворка і аб магчымасцях пашырэння ўзаемадзеяння ў сферы навукі і тэхналогій. «Вашы навукоўцы маглі б больш актыўна працаваць у нашых лабараторыях і наадварот», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. Ён таксама прапанаваў разгледзець магчымасці ўзаемадзеяння вучоных у рамках міжнародных праектаў, што рэалізуюцца з прыцягненнем срадкаў ЕС.

У сваю чаргу Петка Дойкаў падзякаваў за агучаныя прапановы і ініцыятывы. Ён падкрэсліў, што жаданне развіваць двухбаковыя адносіны цалкам узаемнае. «У нас у Балгарыі глядзяць на Беларусь як на краіну, з якой мы хочам развіваць адносіны. Мы вельмі станоўча ацэньваем дыялог і супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі ў апошнія гады. Вы правільна адзначылі, што гэты дыялог неабходна развіваць у будучыні», — падсумаваў ён.

# СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ

## Сектару апрацоўчай прамысловасці Брэстчыны трэба аддаць асаблівую ўвагу

**Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Брэсцкай вобласці, старшыня назіральнага савета ААТ «БелАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЗ-Холдынг» Міхаіл МЯСНІКОВІЧ наведаў на мінулым тыдні Пінск. Падчас візіту быў разгледжаны ход рэалізацыі комплекснага плана мерапрыемстваў па ўстойлівым сацыяльна-эканамічным развіцці горада да 2020 года. Са справаздачамі выступілі кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў, паведамляе сайт верхняй палаты беларускага парламента.**

Міхаіл Мясніковіч таксама прыняў удзел у пасяджэнні Савета дырэктараў ААТ «Кузлітмаш», дзе былі абмеркаваны вынікі работы адкрытага акцыянернага таварыства за першае паўгоддзе бягучага года, а таксама стратэгія далейшага развіцця, у тым ліку пытанні мадэрнізацыі і тэхпераасначшэння.

«У сувязі з тым, што шэраг вытворчасцяў і кірункаў дзейнасці, якія склаліся апошнім часам на «Кузлітмашы», перараэмяркоўваюцца на іншыя заводы, ці не атрымаецца так, што адсюль сыдуць заказы, а належнага замяшчэння не будзе», — пацікавіўся Міхаіл Мясніковіч. Генеральны дырэктар і кіраўніцтва Савета дырэктараў праінфармавалі, як вырашаюцца гэтыя пытанні.

Аналізуючы структуру валавога рэгіянальнага прадукту Брэсцкай вобласці, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што доля апрацоўчай прамысловасці ў яе можа быць больш вялікай. «Мы павінны аддаваць належную ўвагу развіццю прамысловага патэнцыялу рэгіёна. Нягледзячы на тое, што трацiна валавога рэгіянальнага прадукту вобласці прыпадае на прамысловасць, у яе структуры каля 50 % — гэта харчовая і перапрацоўчая галіны і толькі каля 10—11 % складае прадукцыя машынабудавання», — канстатаваў ён.


sovrep.gov.by

Згодна з сусветнай практыкай, да эканамічна ўстойлівых адносяцца дзяржавы, доля апрацоўчай прамысловасці якіх у ВУП — 25 % і вышэй, нагадаў старшыня Савета Рэспублікі. «Па краіне мы так і маем — дзесьці 24—27 %, але калі паглядзець апрацоўчую прамысловасць Брэсцкай вобласці, яна прасядае», — адзначыў ён.

У сувязі з гэтым пры разглядзе стратэгіі развіцця рэгіёна на наступную пяцігодку, работа над якой пачынаецца, Міхаіл Мясніковіч прапанаваў аддаць асаблівую ўвагу фарміраванню дадатковых магутнасцяў на дзеючых прадпрыемствах і стварэнню новых менавіта ў сектары апрацоўчай прамысловасці. «Гэта будзе і рост валавога рэгіянальнага прадукту і, безумоўна, структура ВРП будзе змяняцца ў лепшы бок», — падсумаваў ён.

# БАЙЦАМ НЯБАЧНАГА ФРОНТУ

## прысвячаецца памятны знак, адкрыты пад Гомелем, у прыгожым мястэчку Чонкі, на тэрыторыі аднайменнага санаторыя

**Ён нагадвае пра савецкага ваеннага дзеяча Ілью Старынава і Аператыўна-навучальны цэнтр, які дзейнічаў тут у ліпені — жніўні 1941 года пры штабе Заходняга і Цэнтральнага франтоў. Ініцыяваў устаноўку валуна член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Павел ЖДАНОВІЧ:**

— Ідэя ўвекавечання памяці ваенных разведчыкаў, большасць імёнаў якіх невядома, з'явілася яшчэ ў 2005 годзе. Абрэвіятурай АНЦ — Аператыўна-навучальны цэнтр — мы хацелі аддаць даніну памяці ўсім, чый подзвіг у імя Радзімы застаўся невядомы, але ўнёсак у перамогу неацэнны. На тэрыторыі Гомельшчыны дзейнічалі два падраздзяленні цэнтра — у Маркавічах, дзе праходзіла навучанне частка вайскоўцаў 53-га палка НКУС, а ў Мазыры дыверсійнай рабоце ў тыле ворага вучылі жанчын.

У Аператыўна-навучальным цэнтры ў Чонках падрыхтавалі больш за дзве тысячы дыверсантаў, разведчыкаў і падрыўнікоў, каля 60 разведвальна-дыверсійных груп для дзейнасці ў тыле ворага. А пазней — і інструктараў для работы ў падобных цэнтрах у Курскай, Маскоўскай, Арлоўскай, Смаленскай, Тульскай, Чарнігаўскай абласцях...

Палкоўнік Ілья Старынаў — савецкі ваенны дзеяч, адзін з заснавальнікаў часцей спецыяльнага прызначэння, прафесар. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, пяццю ордэнамі Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Айчыннай вайны II ступені, Дружбы народаў, а таксама іншымі ордэнамі і медалямі. Удзельнік Грамадзянскай вайны, баявых дзеянняў у Іспаніі, савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай вайны.

— Палкоўніка Ілью Старынава называлі «дыверсантам № 1 у свеце», якога Адольф Гітлер зваў сваім асабістым ворагам, — кажа **старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання «Ветэраны ваеннай разведкі», палкоўнік у адстаўцы Аляксандр БІТУС.** — Старынаў усё жыццё прысвяціў ваеннай справе, арганізаваў падрыўную дзейнасць на акупаванай фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі. Ён стаяў каля вытокаў стварэння падраздзяленняў сіл спецыяльнага прызначэння «Вымпел», «Альфа» і іншых.



Цікава, Што Ілья Старынаў пражыў 100 гадоў (1900—2000). Пасля выхаду ў адстаўку ён да 87 гадоў выкладаў у вучэбных установах КДБ і пісаў кнігі. У іх ліку і мемуары, дзе расказваў пра сваё доўгае жыццё, насычанае прыгодамі.

Трохразовым ружэйным залпам і хвілінай маўчання прысутныя ўшанавалі памяць герояў-вызваліцеляў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# Аб эвалюцыі выбарчага права і перспектывах электроннага галасавання

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Вядома, было б няправільна сцвярджаць, што з гэтага моманту наша заканадаўства канчаткова сфарміравалася. Гэта жывая сфера, якая абавязаная адлюстроўваць рэаліі, што складваюцца ў грамадстве, улічваць сусветныя тэндэнцыі, пастаянна ўдасканальвацца, гібка рэагуючы на зменлівае жыццё. Можна з поўнай упэўненасцю сказаць, што наша выбарчае заканадаўства гэтым характарыстыкам адпавядае.



Фота БелТА.

**— Нагадайце пра найбольш значныя змяненні, якія зведаў Выбарчы кодэкс з моманту свайго прыняцця?**

— Самыя істотныя папраўкі ўносіліся ў 2010 і 2013 гадах. Яны былі накіраваны на тое, каб спрасціць правілы гульні для палітычных сіл, якія жадаюць удзельнічаць у выбарах. Закраналіся ўсе этапы электаральнага працэсу. У прыватнасці, для партый і грамадскіх аб'яднанняў аблягчылі працэдуру вылучэння прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі, адмяніўшы патрабаванне аб наяўнасці пярвічак на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Карэкціроўцы падвергнуўся сам парадак фарміравання акруговых, тэрытарыяльных, участковых выбаркамаў. Было ўстаноўлена, што, як правіла, яны не менш чым на трацiну павінны складацца з прадстаўнікоў палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў. У Выбарчым кодэксе замацавалі інстытут члена ЦВК з правам дарадчага голасу, а таксама члена акруговай выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з правам дарадчага голасу.

> Трэба добра разумець, што работа дэпутата — не проста набор прывілеяў і нейкіх пераваг. Перш за ўсё гэта штодзённая праца па падтрыманні зваротнай сувязі з выбаршчыкамі, рэгулярныя сустрэчы ў працоўных калектывах, абарона і прасоўванне інтарэсаў свайго электарату.

Значна спрацоўся парадак вылучэння кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Палітычныя партыі атрымалі права вылучаць сваіх кандыдатаў і пры адсутнасці на тэрыторыі адпаведнай выбарчай акругі або адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі сваіх аргструктур. Раней гэта было абавязкова.

Вельмі важная змена датычылася парадку праверкі сапраўднасці подпісаў у падтрымку кандыдатаў на прэзідэнцкіх выбарах. Раней, калі выяўляўся хоць бы адзін подпіс, атрыманы на неналежнай тэрыторыі (не ў тым раёне, горадзе, дзе ўтворана камісія, у якую здадзены падпісныя ліст), то і ўсе астатнія прызнаваліся несапраўднымі. Цяпер такія подпісы не правяраюцца і не ўлічваюцца на падпісным лісце, але астатнія могуць прызнавацца сапраўднымі. Аналагічны парадак уведзены і пры праверцы подпісаў на выбарах дэпутатаў (як Палаты прадстаўнікоў, так і мясцовых Саветаў дэпутатаў). Толькі ў гэтым выпадку подпісы павінны быць сабраныя на тэрыторыі адпаведнай выбарчай акругі.

У цэлым Выбарчы кодэкс зведаў нямала карэкціровак, накіраваных на ўдасканаленне выбарчага працэсу. Прычым уніесенню кожнага, нават малаважнага змянення, заўсёды папярэднічае дбайная работа, аналіз мінулых выбарчых кампаній і выпрацоўка на яго аснове прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства. Пэўную ролю ў гэтай рабоце іграюць і міжнародныя назіральнікі на выбарах. Іх справаздачы, якія выдаюцца па выніках выбарчых кампаній, і рэкамендацыі таксама старанна вывучаюцца і часта ўлічваюцца.

**— Раз ужо гаворка зайшла пра міжнародны вопыт — у шэрагу краін, у прыватнасці ў Эстоніі, шырока распаўсюджана электроннае галасаванне. Ці плануецца выкарыстоўваць у беларускім выбарчым працэсе такі інструмент?**

— Справа ў тым, што не ўсе найноўшыя тэхналогіі цяпер можна ўжываць падчас выбарчых кампаній. Акрамя таго, не ўсе з іх могуць быць успрынятыя адназначна і атрымаць высокую станоўчую ацэнку грамадства. Такая сітуацыя назіраецца з электронным галасаваннем. Так, яно выкарыстоўваецца ў некаторых замежных краінах, гэта вельмі зручна для выбаршчыкаў. Але тым не менш, лічу, з ім спяшацца нельга, бо пакуль у яго ёсць шэраг сур'ёзных недахопаў. Напрыклад, паколькі ў беларусаў няма ідэнтыфікацыйных картак, яно не можа забяспечыць адназначную ідэнтыфікацыю грамадзян, якія ўдзельнічаюць у галасаванні, і, адпаведна, празрыстасць працэсу галасавання.

Акрамя таго, і сярод еўрапейскіх дзяржаў няма адзінай пазіцыі па гэтым пытанні, многія краіны неадназначна ставяцца да электроннага галасавання. Так, дастаткова ўспомніць рашэнне Федэральнага Канстытуцыйнага суда Германіі ад 3 сакавіка 2009 года, у якім адзначалася, што электроннае галасаванне не апавядае прынцыпам сумленных і адкрытых выбараў, паколькі не забяспечвае празрыстасць працэсу падліку галасоў. У прэамбуле гэтага рашэння гаварылася пра недапушчальнасць выкарыстання гэтага метаду, пакуль кожны жыхар краіны не будзе дасканала разумець, што адбываецца ў камп'ютарах і іх праграмах.

**— Перыядычна ў Беларусі ўзнікаюць дыскусіі аб неабходнасці пераходу да прапарцыйнай сістэмы правядзення выбараў. Што вы думаеце з гэтай нагоды?**

— Сапраўды, у Беларусі неаднаразова абмяркоўвалася пытанне аб пераходзе на прапарцыянальную выбарчую сістэму, гэта значыць аб уведзенні галасавання за спісы кандыдатаў, якія вылучаюць розныя палітычныя сілы. Такі пераход, безумоўна, мае свае плюсы. Разам з тым не варта выключаць і перавагі дзеючай мажарытарнай сістэмы. А яны ў тым, што людзі галасуюць за пэўнага кандыдата, які прадстаўляе большасць, добра ведае насельніцтва пэўнай акругі і яго праблемы. Напрыклад, у такой краіне, як Вялікабрытанія, выбарчая сістэма якой не выклікае нараканняў ні з чыйго боку, выкарыстоўваецца мажарытарная выбарчая сістэма.

Многія краіны праводзяць выбары па змешанай сістэме. Гэта, па сутнасці, сукупнасць дзвюх сістэм: прапарцыянальнай і мажарытарнай. Пры гэтым частка мандатаў размяркоўваецца па прапарцыянальнай сістэме (па партыйных спісах), а іншая частка — па мажарытарнай сістэме (галасаванне за кандыдата).

Маё меркаванне асабіста: у нас ужо ёсць перадумовы для пераходу да змешанай выбарчай сістэмы. Аднак гэты пераход, па сутнасці, адносіцца да пытанняў, якія з тых ці іншых прычын не могуць быць рэалізаваны з дапамогай простай карэкціроўкі Выбарчага кодэкса.

Існаванне ж мажарытарнай выбарчай сістэмы абумоўлена наяўнасцю ў Канстытуцыі нормы, якая прадугледжвае магчымасць адклікання дэпутата. Такое адкліканне немагчыма пры існаванні прапарцыянальнай выбарчай сістэмы, калі галасаванне адбываецца за спісы кандыдатаў у цэлым па краіне.

**— Сёлета ў Беларусі пройдуць чарговыя парламенцкія выбары. З якімі важнымі законапраектамі трэба будзе працаваць новаму скліканню?**

— У Беларусі штогод зацвярджаецца план падрыхтоўкі законапраектаў. Цяпер НЦЗПД рыхтуе яго праект на 2020 год. Прапануецца распрацоўка новых законаў, у іх ліку «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання», «Аб самарэгулявальных арганізацыях», «Аб латарэйнай дзейнасці», «Аб валанцёрскай дзейнасці», «Аб доступе да інфармацыі аб дзейнасці судоў агульнай юрысдыкцыі».

Акрамя таго, прадугледжана карэкціроўка палажэнняў шэрагу кодэксаў, напрыклад, Банкаўскага, Падатковага, Кодэкса аб культуры, Кодэкса аб нетрах, кодэксаў па пытаннях адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці і іншых. Цяпер у Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца некалькі важных законаў, якія трэба будзе разглядаць у другім чытанні, і яны патрабуюць вельмі сур'ёзнага падыходу. У якасці прыкладу дастаткова згадаць праект закона «Аб персанальных даных».

Усе гэтыя законапраекты маюць важнае практычнае значэнне, і таму ад будучага складу парламента, ад навыкаў і здольнасцяў, багажу ведаў і жыццёвага вопыту дэпутатаў будзе многае залежыць у заканатворчым працэсе.

**— Вадзім Дзмітрыевіч, што б вы як намеснік старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі хацелі пажадаць будучым кандыдатам?**

— Па вопыце папярэдніх выбарчых кампаній магу сказаць, што ў першую чаргу кандыдатам неабходна ўважліва вывучыць дзеючае заканадаўства. Практыка паказвае, што многія парушэнні падчас выбарчага працэсу выкліканы простай няўважлівасцю і часам нават грэбаваннем прававымі нормамі. Гэта дазволіць пазбегнуць канфліктаў і забяспечыць суладнае ўзаемадзеянне паміж кандыдатамі і выбарчымі камісіямі.

І другое — трэба добра разумець, што работа дэпутата — не проста набор прывілеяў і нейкіх пераваг. Перш за ўсё гэта штодзённая праца па падтрыманні зваротнай сувязі з выбаршчыкамі, рэгулярныя сустрэчы ў працоўных калектывах, абарона і прасоўванне інтарэсаў свайго электарату.

У цэлым адзначу, што, як правіла, нашы дэпутаты — гэта практыкі, выдатна адукаваныя, якія валодаюць вялізным жыццёвым вопытам, здольныя прымаць якасныя законы з улікам праблем, з якімі сутыкаюцца як простыя грамадзяне, так і прадстаўнікі бізнесу. Абсалютна ўпэўнены, што і гэтым разам у парламент будуць абраныя самыя годныя кандыдаты, якія карыстаюцца падтрымкай насельніцтва і здольныя апраўдаць давер выбаршчыкаў.

**<u>У тэму</u>**

## Уважлівы падлік

**Больш за 260 нацыянальных назіральнікаў на парламенцкіх выбарах атрымалі акрэдытацыі выбаркамаў**

**Цэнтральная, тэрытарыяльныя і акруговыя выбарчыя камісіі на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання акрэдытавалі, па звестках на 9 верасня, 261 нацыянальнага назіральніка. Такая інфармацыя размешчана на сайце ЦВК, паведамляе БелТА.**

Назіральнікаў на выбары да гэтага часу накіравалі пяць палітычных партый. Усяго ад іх акрэдытавана 19 чалавек. Грамадскія аб'яднанні ў гэтым плане больш актыўныя, ад іх акрэдытаваліся ўжо 215 чалавек. У лідарах — рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», Беларускі саюз жанчын і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Ад грамадзян шляхам падачы заяў накіравана 27 назіральнікаў.

Акрэдытаваныя пры акруговых выбаркамах маюць права прысутнічаць у гэтых камісіях пры прыёме пратаколаў аб выніках галасавання на выбарчых участках. Назіральнік, накіраваны на пасяджэнні ўчастковай выбарчай камісіі, мае права ў ліку іншага весці назіранне на адпаведным участку для галасавання. Падчас датэрміновага галасавання і ў дзень выбараў назіральнікі маюць права атрымліваць інфармацыю пра колькасць выбаршчыкаў, уключаных у спісы, і пра колькасць тых, хто прыняў удзел у галасаванні.

Што датычыцца міжнародных назіральнікаў, то пакуль іх акрэдытавана 24, усе ад краін СНД. Замежныя эксперты маюць права прысутнічаць на пасяджэннях выбарчых камісій, сустракацца з кандыдатамі ў дэпутаты і іх даверанымі асобамі, назіраць за выдачай бюлетэняў, ходам галасавання.

Нагадаем, што выбары ў Палату прадстаўнікоў прызначаны на 17 лістапада, у Савет Рэспублікі — на 7 лістапада.

# «ЕЗДЗІЛІ ПА ЛЕСЕ З МІГАЛКАМІ...»

## Пошукі працягваюцца

Той дзень Андрэй Валер'евіч памятае як сёння. Аб прапажы хлопчыка паведамілі ў 18.20.

— Я тады выехаў з напарнікам першым нарадам. Самыя першыя туды прыехалі, калі маці патэлефанавала, — успамінае суразмоўнік. — Мы тады ездзілі па лесе, сігналілі, мігалку ўключылі, каб яго зарыентаваць. Думалі, што ён выйдзе на гукі...

Болбат браў удзел у пошуках хлопчыка з першых дзён тады яшчэ на пасадзе супрацоўніка ДАІ. Працягвае гэту работу ў якасці ўчастковага.

— Пошукі вядуцца. Цяпер цяжкасці з тым, што складана нешта ўбачыць з-за зялёнага лісця, больш спрыяльны перыяд для пошукаў — гэта восень і зіма. Асаблівая ўвага па-ранейшаму надаецца балоту Дзікому. Гэта вельмі небяспечнае месца, куды нават валанцёраў не пускалі, каб іх саміх не згубіць. Ішлі толькі падрыхтаваныя супрацоўнікі, — расказвае Андрэй.

Сам ён таксама неаднаразова «прачэсваў» гэту мясцовасць. Але трэба быць асцярожным. З мясцовых жыхароў на балота ходзяць толькі тыя, хто сапраўды ведае гэтыя мясціны: у асноўным усе ідуць убок ад балота.

— На маім участку гэта адзіны зніклы без вестак. За два гады нераскрытых правапарушэнняў тут не было. Бывала, што прападаў чалавек (тут дзядуля быў прапаў у лесе, але яго знайшлі). Нядаўна мне патэлефанавалі леснікі, што нібыта знайшлі Максіма, але інфармацыя аказалася недакладная, проста чутку нехта пусціў. Вядома, мы трымаем на кантролі гэту сітуацыю, — кажа Андрэй.

Асноўная версія — яна днямі была агучана ў Міністэрстве ўнутраных спраў, — што хлопчык заблукаў у лясным масіве. Андрэй Болбат нават канкрэтызуе: Максім ішоў па дарозе і пераблытаў напрамкі. Дамоў яму трэба было зварочваць лявей, а ён павярнуў на балота Дзікое. Туды таксама вядуць сцежкі, па якіх ходзяць мясцовыя па рогі аленяў. Гэтыя сцежкі і маглі заблытаць хлопчыка. Ён ішоў проста на балота.

— Многія жыхары зараз збіраюць журавіны. Цяпер больш-менш суха, але ўсё роўна ў незнаёмыя мясціны не ходзяць, — адзначае Андрэй Болбат.

Але вернемся да сённяшніх праблем і клопатаў участковага інспектара. Іх на тэрыторыі Навадворскага сельскага савета таксама нямала. Хтосьці скраў збожжа, нехта выпіў на рабоце, нехта гандлюе самагонам...

## З выездам на месца

На міліцэйскім аўто ад'язджаем ад Свіслацкага раённага ўпраўлення ўнутраных спраў. Начальнік аддзялення аховы правапарадку і прафілактыкі Дзяніс Паўлючэня патлумачыў: да яго паступілі звесткі, што рабочы на ферме крадзе кармы. Трэба гэты факт праверыць на месцы.

Ад Свіслачы да Новага Двара кіламетраў трыццаць. Гэта цэнтр сельсавета. Траса Свіслач — Пружаны даволі спакойная, ды і сама дарога роўная — некалькі гадоў таму яе абнавілі. Праходзіць яна вакол Белавежскай пушчы. Але нам трэба звярнуць убок, і да Новага Двара едзем яшчэ кіламетраў дзесяць па такой жа роўнай трасе. Падумалася: як важна ехаць па добрай дарозе, колькі на гэтым можна захаваць нерваў.

Адразу накіроўваемся ў сельскі Савет. Старшыня Уладзімір Здановіч гатовы далучыцца да рэйду. Яму важна, каб жыхары не ўступалі ў супярэчнасць з законам. А інспектар, па яго словах, такія факты заўсёды трымае на кантролі.

— Тут каля дзвюх тысяч жыхароў, гэта амаль што самы вялікі сельскі Савет раёна, — кажа Уладзімір Васільевіч. — Ёсць у нас і тыя, хто вярнуўся з месцаў пазбаўлення волі, і абавязаныя, і кандыдаты на ЛПП. Яны часцей за ўсё трапляюць у спісы правапарушальнікаў. Некалькі чалавек асуджаны і адбываюць пакаранне. У асноўным — за крадзяжы.

Вось і чарговая справа таксама звязана з крадзяжом. Праўда, пакуль толькі вядзецца праверка. З гэтай мэтай пад'язджаем да дома мясцовага жыхара, які працуе на ферме і быў заўважаны на крадзяжы камбікорму. Гэты прадукт ён мяняе на самагон.



— Мы маем санкцыю на агляд, таму павінны агледзець і дом, і ўсе іншыя гаспадарчыя пабудовы. Як бачым, на грукат ніхто дзверы не адчыняе, хоць каля дома стаіць веласіпед. Значыць, гаспадар альбо не адчыняе дзверы, альбо кудысьці адышоў, — каментуе сітуацыю Андрэй Болбат.

Па словах старшыні сельскага Савета, на мінулым тыдні мужчына знаходзіўся на лячэнні ў бальніцы, бо апарыў нагу. Увогуле кіраўнік мясцовай улады характарызуе работніка фермы як працавітага, здатнага да любой работы чалавека. Ён яшчэ і заядлы зборшчык грыбоў і ягад, а цяпер якраз журавінны сезон. І навошта, здаецца, красці камбікорм, калі можна мець нядрэнны дадатковы заробак на ягадным промысле? Многія так і робяць, у тым ліку і тыя, хто вярнуўся з месцаў адбывання пакарання і стаіць на прафілактычным уліку. За дзень набіраюць і 4, і 5 вёдраў. Нарыхтоўшчыкі адразу на балоце прымаюць ягаду па 3 рублі за кілаграм. Старшыня сельсавета падлічыў: за пяць вёдраў вагой сем кілаграмаў можна зарабіць 100 рублёў. За тыдзень атрымліваецца сярэдняя месячная зарплата. Нават у працоўным графіку раздатчыка кармоў ёсць выхадныя, каб зарабіць яшчэ і на зборы журавін.

## Гэта справядлівы ўчастковы...

На маршруце яшчэ адзін адрас. Андрэй Болбат тлумачыць: едзем да мужчыны, якога днямі затрымалі на рабоце п'яным.

Аўтамабіль спыняецца каля неблагога на выгляд дома. На грукат выходзіць мужчына ў цяльняшцы. Што выпіў на рабоце, не адмаўляе. І на ўчастковага не скардзіцца, наадварот, кажа, што ён выконвае свае абавязкі згодна з законам.

Івану Іванавічу 56 гадоў. Жыве ў дзедавым доме не так даўно, дагэтуль жыў з грамадзянскай жонкай і яе васьмярымі дзецьмі ў іншай вёсцы. Разам нарадзілі яшчэ дваіх — блізнятаў. Мужчына панаракаў на свой лёс, маўляў, памерла сужыцельніца, дзяцей усіх забралі. Зарплата на ферме невялікая, хоць ён працуе там больш за 20 гадоў.

— Іван — абавязаная асоба, таму ў яго вылічваюць 70 % зарплаты на дваіх дзяцей, якія знаходзяцца ў прыёмнай сям'і, — кажа Андрэй Болбат. — Дзеці малыя, таму яшчэ гадоў сем будзе выплачваць аліменты.

Сам Іван, па ўсім відаць, да дзяцей прыязджае рэдка. Кажа, няма чаго ім прывезці. Толькі паведаміў, што малыя яго ведаюць. У любым выпадку ім будзе да каго вярнуцца, пасля таго як стануць паўналетнімі. Бо ў прыёмнай сям'і дзеці могуць знаходзіцца да 18 год, а потым уладкоўваюцца самі — вучацца альбо працуюць. Можа, тады і спатрэбіцца бацькоўскі дом, і работа тут знойдзецца. Ды і дому патрэбны руплівы гаспадар. Калі ў самых пакоях сякі-такі парадак, то двор неахайны — і плот паваліўся, і пустазелле расце паўсюдна.

## Хто каго?

Самі жыхары прызнаюцца: тут мясцовасць — рай для самагоншчыкаў. Яны ставяць свае міні-заводы ў гушчары Белавежскай пушчы. Як іх знайсці? Андрэй Болбат не спяшаецца раскрываць сакрэты сваёй дзейнасці, але намякае, што дапамагае насельніцтва. Ёсць і ўласныя назіранні. Заўважана, што часцей за ўсё такія міні-заводы ставяць каля вады, а пад'езды яшчэ і маскіруюць — напрыклад, на лясной дарозе ў зямлю ўкопваюць трубы, у якія ставяць елкі, маўляў, дарогі сюды няма. Ёсць іншыя спосабы маскіроўкі. Напрыклад, перасоўныя самагонныя апараты.

У вёску Новы Двор якраз прыгналі адзін такі агрэгат з Белавежскай пушчы. Цяпер ён знаходзіцца на падворку пустуючага дома. Чаму яго не канфіскавалі? Аказваецца, уся справа ў камплектацыі.

Між тым пакуль пісаўся гэты тэкст, Дзмітрый Ігнацьеў заняў іншую пасаду. Ён цяпер выконвае абавязкі камандзіра ўзвода па ахове тэрыторый радыяцыйнага забруджвання Добрушскага раённага аддзела ўнутраных спраў. Значыць, будзе пільна сачыць за парадкам на тых выселеных тэрыторыях, якія людзям наведваць забаронена. Прынамсі, некаторыя імкнуцца менавіта на гэтай зямлі папаляваць ці праз яе незаўважна правезці металалом у Расію.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ, фота аўтара.**

*г. Добруш.*

«МС» СПЫТАЛА

## Ці звярталіся вы да свайго ўчастковага?

**Вікторыя Дзяшковіч, Мінская вобласць:**

*— Я жыву ў сельскай мясцовасці, таму ў нас усе ведаюць адно аднаго. А ўчастковы карыстаецца вялікім аўтарытэтам, таму да яго звяртаюцца часта. Менавіта мне ён не раз дапамагаў з юрыдычнымі пытаннямі. Наш участковы — гэта не толькі чалавек пры пасадзе, гэта наш аднавяскоўвец, які заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу.*

**Анастасія Пракапенка, Гомельская вобласць:**

*— Мне не прыходзілася звяртацца да свайго ўчастковага, але ведаю, што работа ў яго даволі складаная. Людзі розныя бываюць: хто ноччу ў дзверы стукае, шукаючы дапамогу, хто ўдзень праходу не дае. А ў вёсцы рознае бывае: і крадзяжы, і бойкі... Вось і атрымліваецца, што работа ў яго без выхадных і адпачынку.*

**Ганна Пацяйчук, Брэсцкая вобласць:**

*— Памятаю, як мае суседзі ноччу ладзілі вечарыну і вельмі шумна сябе паводзілі. Калі цярпенне скончылася, я патэлефанавала нашаму ўчастковаму. Той прыйшоў і належным чынам з усім разабраўся. Добра, калі ёсць чалавек, які можа дапамагчы ў такіх сітуацыях.*

**Максім Лубачкін, Гродзенская вобласць:**

*— У нашым раёне ўчастковы — гэта чалавек, на якога заўсёды можна спадзявацца. Ён і парады добрыя дасць, і людзям у цяжкіх абставінах дапамажа. Менавіта мне звяртацца да яго не прыходзілася, але ведаю, што ў любым выпадку ён вырашыць праблему.*

РЭПЛІКА

## МАДРа не Мадэра

### У Брэсце перамудрылі з назвамі прыпынкаў. Патрэбна работа над памылкамі

**Вядома, не памыляецца толькі той, хто нічога не робіць. А ў Брэсце апошнім часам у працэсе падрыхтоўкі да 1000-годдзя зроблена так многа, што няёмка было б дакараць за асобныя хібы. Але памылкі ўсё ж лепей выпраўляць. Таму і пішу гэтыя радкі.**

Зусім незадоўга да афіцыйных святкаванняў у цэнтральнай частцы горада з'явіліся новыя прыпыначныя павільёны. Замест старых навесаў усталявалі стыльныя, сучасныя. Памяняліся і надпісы на іх. Цяпер назвы прыпынкаў значацца на беларускай мове і лацініцай.

І вось пасля адпачынку выходжу на прыпынку, куды езджу апошнія 28 гадоў... і не пазнаю. Прыпынак называўся МОПРа, а на ім напісана МАДРа.

Яно і МОПРа — не лепшая назва для вуліцы, але гучыць неяк лепш, бо прывычная. Дык вось, усё жыццё я лічыла, што абрэвіятура — МОПРа — расшыфроўваецца як «Міжнародная арганізацыя прафсаюзаў рабочых», па-руску МОПРа. Ды і, відаць, не я адна прыдумала сваю расшыфроўку, бо ніхто толкам не памятаў, чаму так назвалі вуліцу. Гадоў пятнаццаць таму даводзілася назіраць, як маленькі хлопчык тузаў маці за руку і пытаўся: «Мама, а хто такі Мопр?» І маладая жанчына доўга не думаючы адказала: «Відаць, той, хто гэту вуліцу называў».

А калі сёлета мянялі шыльды, падняли дакументы, знайшлі старое рашэнне выканкама, паводле якога вуліца названая ў гонар міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі. Яе, відавочна, няма на свеце вельмі даўно. А назва ў сучасных рэаліях гучыць, мякка кажучы, дзіўна, бо аддалена патыхае нейкімі беспарадкамі, экспартам рэвалюцый. Але гэта адно.

Другая праблема, што ў гэтай крыху недарэчнай абрэвіятуры куча памылак. Калі ўжо дакладна скарачаць, то будзе наогул МАДБРа, ледзь не чупакабра. Ды і спецыялісты гавораць, што абрэвіятура МОПР будзе пісацца як МОПР і па-беларуску, бо запазычаная з рускай мовы.

А дні тры таму пачула, як новы надпіс абмяркоўваюць двое дзядзькоў. Адзін кажа: «А што за Мадра такая? Можа, Мадэра хацелі напісаць, ды літару прапусцілі». «О, Мадэра ў савецкія часы была смачная!» — заўважыў другі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ПЕРШЫ — ПА ВЫКЛІКУ

### Большасць злачынстваў, раскрытых па гарачых слядах у вобласці, — на рахунку ўчастковых

**Начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі УУС Брэсцкага аблвыканкама Генадзь ВАЙТОВІЧ не толькі кіруе службай участковых на абласным узроўні, Генадзь Васілевіч добра ведае гэтую службу. Некалі ён пачынаў работу ў міліцыі з пасады ўчастковага інспектара ў Брэсцкім РАУС. З ім і размаўляем пра асаблівасці цяперашняй работы міліцыянера на сваім участку. Пачынае гаворку Генадзь Вайтовіч з прыемнай акалічнасці.**



— Сёлета на абласную Дошку пашаны занесены наш супрацоўнік Сяргей Манцэвіч, старшы ўчастковы інспектар Бярозаўскага РАУС. Працуе Сяргей Мікалаевіч у Сігневіцкім сельсавеце. Разам з мясцовай уладай, саветам па прафілактыцы правапарушэнняў участковы зрабіў нямала для падтрымання законнасці і парадку на сваім участку. Яго заўважылі і адзначылі. Як той казаў, не для гэтага працуем, але ўсё роўна прыемна, калі заахвочваюць міліцыянера.

> Сёлета наш супрацоўнік атрымаў нажавое раненне ў Іванаўскім раёне пры затрыманні хулігана. Такая спецыфіка — участковы часта аказваецца першым, калі паступае сігнал.

Асабліва сельскія супрацоўнікі ўвесь час знаходзяцца на пярэднім краі: участковы разглядае скаргі, мірыць адных, ушчувае іншых, выязджае па выкліках, праводзіць прафілактычную работу з праблемнымі грамадзянамі.

***— Такім чынам, участковы працуе ў адной звязцы з сельскім Саветам?***

— Вядома. Пры кожным органе мясцовай улады створаны саветы па прафілактыцы, якія праводзяць свае пасяджэнні прыкладна раз на месяц. Туды запрашаюцца грамадзяне, якія сваімі ўчынкамі альбо паводзінамі, ладам жыцця парушаюць грамадскі парадак. З імі гутараць, угаворваюць, «прапясочваюць», папярэджваюць. Гэта і называецца выхаваўчай работай. Не заўсёды яна прыносіць жаданыя вынікі, але ж нават калі адзін з дзесяці возьмецца за розум або хоць крышачку менш стане піць ці дэбашырыць, варта гэтую работу праводзіць зноў і зноў.

На асаблівым кантролі міліцыянераў знаходзяцца асобы, якія вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі. Часта патрабуецца аказваць ім рэальную дапамогу ў працаўладкаванні, сацыялізацыі. А часам вельмі важна паказаць, што міліцыя трымае яго ў полі зроку. Бо не сакрэт жа, што такіх грамадзян нярэдка пабойваюцца і аднавяскоўцы. Асабліва, калі вёска невялікая, засталіся некалькі сем'яў пенсіянераў ды адзінокіх бабулек. Гэта такі, можа, не асаблівá бачны бок нашай штодзённай работы, але яна вельмі важная. У горадзе ж участковы працуе з дамавымі, вулічнымі камітэтамі. У вялікіх гарадах свая спецыфіка, і праблемная кантынгенту грамадзян яшчэ больш. Адным словам, работы хапае.

***— Сёння выпадае гаварыць, што прафесія ўчастковага даволі небяспечная. Маю на ўвазе рэзанансную трагедыю мінулага года, калі ў Іванацэвіцкім раёне загінуў участковы пры планавай праверцы паляўнічай зброі.***

— Так, самае горкае, калі даводзіцца хаваць калегу, ды яшчэ ў такім маладым узросце. Ужо і сёлета наш супрацоўнік атрымаў нажавое раненне ў Іванаўскім раёне пры затрыманні хулігана. Такая спецыфіка — участковы часта аказваецца першым, калі паступае сігнал, людзі просяць дапамогі. Нярэдка ён выязджае адзін. Але ж назвaны вышэй выпадкі, на шчасце, усё ж выключэнне, а не правіла. А правіла, што ўчастковыя спраўды вельмі часта аператыўна аказваюцца на месцы злачынства і раскрываюць яго або дапамагаюць раскрыць. Здараецца, самі затрымліваюць правапарушальнікаў.

***— Можна прывесці канкрэтныя прыклады?***

— Вось адкрываю ўчарашнюю зводку: у Бярозаўскім раёне ўчастковы праводзіў прафілактычны аб'езд падчас уборкі ўраджаю. Заўважыў падазроны аўтамабіль, праверыў, а там — паўтара цэнтнера скрадзенага збожжа. У выніку збожжа вярнулі сельгаспрадпрыемству, злодзей панёс адказнасць. А выпадак паслужыў навукай для тых, хто ахвочы да чужога, таго, чаго не вырошчваў... Тут значацца таксама дробныя крадзяжы, раскрытыя ўчастковымі. Калі схапіць за руку на дробным крадзяжы, гэта прафілактыка крадзяжу большага...

Калі звярнуцца да крыху ранейшых зводак, чытаем: у Драгічынскім раёне ўчастковы інспектар Сяргей Лісавец самастойна раскрыў злачынства. Паступіла заява аб знікненні грамадзяніна з вёскі Татарнавічы. Участковы ўстанавіў, што мужчыну збіла машына. Пазней знайшоў цела, якое віноўнік аварыі прыхаваў на ўзбочыне. Аператыўна быў знойдзены і кіроўца, які ўчыніў ДТЗ са смяротным зыходам...

Кобрынскі ўчастковы Ігар Бартноўскі выратаваў жанчыну, якая была гатовая скочыць з моста. Аб падазроных паводзінах жанчыны паведамілі на лінію 102 відавочцы, першым на месцы здарэння аказаўся ўчастковы, ён і сумеў адцягнуць увагу патэнцыяльнай суіцыдніцы размовамі, а потым здолеў падысці бліжэй...

А вось з самых нядаўніх зводак. На новым аўтавакзале ў Брэсце пенсіянерка забылася тэлефон. Калі агледзела дома, пазваніла ў міліцыю. Першым на месца прыбыў участковы Андрэй Патапчук. Міліцыянер агледзеў запісы камер відэаназірання і па прыкметах вылічыў падазраваную, потым даведаўся, што білет яна ўзяла ва ўкраінскім напрамку. І ўжо ў пункце перасячэння мяжы візіцёрку затрымалі, у яе багажы і аказаўся той самы тэлефон, які вярнулі пенсіянерцы.

Ды такіх прыкладаў шмат. Вось, скажам, за 9 верасня ў вобласці здзейснена 30 злачынстваў, пяць з іх раскрыта ўчастковымі. І так штодня, кожнае чацвёртае, пятае злачынства раскрываецца ўчастковымі, асабліва ў сельскай мясцовасці. І гэта не нейкія геройчныя ўчынкі. Гэта работа, штодзённая, для гэтага і стваралася наша служба 95 гадоў таму.

***— Але ж сёння ўмовы і фактары работы адрозніваюцца не толькі ад тых, якія былі амаль ці не сотню гадоў, але і ад таго, як працавалі папярэднікі 40—30 гадоў таму.***

— Я назваў бы нашых сучаснікаў грамадствам павышанай канфліктнасці. Канфлікты здараюцца паміж суседзямі, членамі сям'і, людзьмі малазнаёмымі, выпадковымі сабутэльнікамі. І нярэдка становіцца прычынай злачынства. Скажам, раней асабліва ў вясковым асяродку палічылі б за сорам званіць у міліцыю, калі чыя каза ўлезла ў суседскі агарод. Цяпер усё проста, а сігнал аўтаматычна азначае ўчастковаму каманду на выезд. І траціць ён доўгія гадзіны часу на высвятленне чужых адносін, бо злашчасная каза ўзновіць у памяці бакоў усе назапашаныя гадамі крыўды. Гэта фігуральны прыклад і, можа, адзін з самых нейтральных. А калі сямейны канфлікт заканчваецца пабоямі, гвалтам, тут ужо даводзіцца выкарыстоўваць сілу альбо спецсродкі. Гісторыя сабутэльнікаў, якія спачатку пілі, потым біліся, становіцца амаль што крымінальнай класікай. І ўсё гэта даводзіцца разбіраць участковаму інспектару. А ў вёсцы ён і за АМАП, і за патрульны нарад, і за ДАІ. Такім чынам чалавек увесь час у стане стрэсу. А вось сам ён павінен умець гасіць канфлікты, усталёўваць спакой і парадак. Сёння, як вы ведаеце, ад міліцыі асабліва патрабуецца захоўваць законнасць, праяўляць павагу і такт у адносінах да грамадзяніна. Аб гэтым мы гаворым на кожнай нарадзе з нашымі ўчастковымі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ПАСЛУГІ НА КОЛАХ

## Патрэбы вяскоўцаў Рагачоўшчыны сёння задавальняюць спецыялізаваныя машыны, якія прывозяць ім не толькі прадукты і пошту, але канцэрты і кнігі



Дырэктар Збароўскага сельскага дома культуры Антаніна ВАРАНЦОВА прэзентуе міні-праект «Скарбы Збароўскай зямлі».

**Эфектыўнасць абслугоўвання насельніцтва і яго занятасць. Як гэтыя праблемы вырашаюць на практыцы ў Рагачоўскім раёне? Гэтым зацікавіліся старшыні Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню Гомельскай вобласці і наведалі шэсць сельсаветаў раёна ў межах традыцыйнага абласнога семінара.**

У аграгарадку Лучын Забалацкага сельсавета госці пазнаёміліся з работай базавай школы, якую прэзентаваў яе кіраўнік, **дэпутат райсавета Аляксандр АМЯЛЮСІК.** У Запольскім сельсавеце адбылося знаёмства з мясцовымі праектнымі ініцыятывамі. А гэта музеі «Таямніцы гаючых раслін», «Беларуская лялька», дом-музей пісьменніка Уладзіміра Кігна-Дзедлава, добраўпарадкаванне парку ў вёсцы Кісцяні, арганізацыя фестывалю «Дзяцінства — чароўная краіна» і многія іншыя. Падобная актыўнасць спрыяе занятасці насельніцтва, развіццю тэрыторый сельсаветаў і папулярызацыі раёна. У Збароўскім сельсавеце акцэнтавалі ўвагу на дзейнасці Рагачоўскага вопытна-вытворчага лясніцтва — паказальнага ў плане добраўпарадкавання і досведу работы па вырошчванні лясных культур. Таксама госці азнаёміліся з Гадзілавіцкім сельсаветам і вёскай будучыні — аграгарадком Ціхінічы, цэнтрам аднайменнага сельсавета.

Тут працуе фізкультурна-аздараўленчы комплекс з басейнам, спартыўнай арэнай, трэнажорнай залай, саўнай, більярдам. Побач — футбольнае поле з трыбунай на 400 месцаў, тэнісная, баскетбольная, валейбольная пляцоўкі. На тэрыторыі аграгарадка ёсць дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці, медыцынская амбулаторыя агульнай практыкі, фельчарска-акушэрскі пункт, аптэка, грамадскі цэнтр культуры і вольнага часу, дзіцячая школа мастацтваў, бібліятэкі.

Гэты населены пункт — адзін з 25 самых перспектыўных Гомельскай вобласці. Вытворчасць тут актыўна развіваецца, і ёсць магчымасці для стварэння новых рабочых месцаў.

— Па сутнасці — гэта прыклад таго, як глыбінка можа жыць цікавым, самадастатковым жыццём і быць прыкладам для іншых, — заўважыла **старшыня абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ.** — Падобныя вёскі будучыні могуць быць у кожным раёне вобласці, прычым неабавязкова ствараць іх з нуля. База ёсць у многіх аграгарадках.

**Старшыня Рагачоўскага раённага Савета дэпутатаў Валянціна ГАНКОВІЧ** адзначыла, што перад сельсаветамі пастаўлена задача зрабіць жыццё мясцовых жыхароў максімальна набліжаным да гарадскога па даступнасці і якасці аказваемых паслуг. Досвед раёна ў гэтым кірунку заслугоўвае ўвагі.

**Намеснік старшыні Рагачоўскага райвыканкама, які адначасова з'яўляецца і намеснікам старшыні мясцовага райсавета, Аляксей ЗАВІШАЎ** падзяліўся досведам работы органаў мясцовага кіравання і самакіравання па павышэнні эфектыўнасці абслугоўвання і арганізацыі занятасці насельніцтва. Ён расказаў пра тое, што тры чвэрці з 200 населеных пунктаў раёна цяпер не маюць стацыянарных гандлёвых аб'ектаў. Іх абслугоўваюць аўталаўкі не толькі спажыўкааперацыі, але і індывідуальных прадпрымальнікаў...

Таксама жыхары многіх вёсак Рагачоўшчыны паступова прыстасаваліся да таго, што абслугоўванне іх патрэб звязана са своечасовым прыбыццём блакітнай машыны перасоўнай пошты. Дарэчы, паштавікі ў сваю чаргу пастаянна пашыраюць пералік паслуг, якія аказваюць сваім кліентам. Цяпер, напрыклад, аддзяленням РУП «Белпошта» ў сельскай мясцовасці дэлегаваны правы па ажыццяўленні многіх банкаўскіх аперацый фізічных асоб. У іх ліку аперацыі з аплатнымі картамі і крэдытаванне. У кожным населеным пункце, дзе жыве больш за 1,5 тысячы жыхароў, аказваюцца паслугі шырокапалоснага доступу ў сетку інтэрнэт.




Аб рабоце Забалацкага сельвыканкама і сельскага Савета дэпутатаў па паляпшэнні абслугоўвання насельніцтва інфармуе старшыня Ала СУЛОЕВА.

— Па пытаннях транспартнага забеспячэння ў райцэнтры і Рагачоўскім раёне ёсць звароты грамадзян, — адзначае Аляксей Віктаравіч. — Летась іх было 16, за паўгода сёлета — 8. Для ўдасканалення транспартнага абслугоўвання насельніцтва неабходна комплексна развіваць сістэму аўтобусных перавозак. Гэта датычыцца развіцця сеткі аўтамабільных дарог, маршрутнай сеткі, сеткі пасажырскіх лінейных збудаванняў, вытворча-тэхнічнай базы, удасканалення перавозак, дыспетчарскага кіравання і кантролю за работай аўтобусаў, павелічэння хуткасці перавозак і павышэння іх камфортнасці...

Сацыяльным абслугоўваннем ахоплены 125 населеных пунктаў Рагачоўскага раёна, з якіх 58 з'яўляюцца маланаселенымі і аддаленымі. Інвалідам і пажылым грамадзянам у аддзяленні сацыяльнай дапамогі дома аказваецца комплекс сацыяльных паслуг. Выкарыстоўваюцца ў тым ліку новыя формы: прыёмная, гасцявая, патранатная сем'і, санаторый дома.

> За першае паўгоддзе гэтага года на Рагачоўшчыне адбылося павелічэнне колькасці занятых у эканоміцы на 69 чалавек. Прапанова вакансій складае больш як пяць для аднаго беспрацоўнага.

Сёлета ў раёне з адной жанчынай заключылі дагавор рэнты. Паводле яго, Рагачоўскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва гарантуе абслугоўванне пяць разоў на тыдзень, а таксама аплату камунальных паслуг за кошт сродкаў мясцовага бюджэту. Грамадзянка працягвае жыць у сваёй кватэры, а пасля смерці яе жыллё пяройдзе ў камунальную ўласнасць раёна.

Дзяржаўныя сацыяльныя стандарты ў галіне аховы здароўя ў раёне выконваюцца ў поўным аб'ёме. Акрамя цэнтральнай раённай бальніцы на 344 ложкі, тут дзейнічае Доўская ўчастковая бальніца, дзе ёсць не толькі тэрапеўтычнае аддзяленне, але аказваецца сястрынскі і паліятыўны догляды. Што датычыцца адукацыйных паслуг, адзначае Аляксей Завішаў, то ў сувязі з невялікай колькасцю дзяцей у сельскіх населеных пунктах установы перапрафілююцца ў навучальна-педагагічныя комплексы ці ліквідуюцца:

— Пры гэтым паўсюдна ажыццяўляецца падвоз дзяцей, якія жывуць у сельскай мясцовасці, у школы і дашкольныя ўстановы іншых населеных пунктаў.

Культурныя мерапрыемствы, што праводзяцца на Рагачоўшчыне, збіраюць аматараў не толькі раёна. Самыя маштабныя — вядомыя далёка за яго межамі: фестываль «Смак мёду», свята «Грай, гармонік! Звіні, прыпеўка!», фестываль песні «Вясёлка над Доўскам»... У раёне склалася сістэма культурнага абслугоўвання насельніцтва не толькі буйных аграгарадкоў, але і маланаселеных, аддаленых вёсачак, дзе праводзяцца традыцыйныя народныя святы і абрады, арганізуюцца канцэртныя выступленні... Значнае месца ў гэтым займае аўтаклуб, які абслугоўвае 188 малых вёсак па ўсім раёне.

Сельскія бібліятэкі сёння — адзіная бясплатная крыніца культуры і інфармацыі, даступная вяскоўцам. Гэтыя ўстановы культуры вельмі запатрабаваныя і з'яўляюцца цэнтрам вольнага часу і месцам кантактаў людзей. У Рагачоўскім раёне цяпер 33 бібліятэкі, 30 з іх — у вёсках. Але ж за апошнія сем гадоў 11 прыйшлося закрыць.

З 2014 года па вёсках раёна курсіруе перасоўная бібліятэка — бібліёбус. Ён абслугоўвае 40 населеных пунктаў па 11 маршрутах. Магчымасці бібліёбуса даюць шанц усім запісацца ў цэнтральную бібліятэку, атрымаць кнігі, а таксама прыняць удзел у буккросінгу.

— Усе віды паслуг, безумоўна, важныя, — дадае намеснік старшыні райвыканкама Аляксей Завішаў. — Аднак, службам, адказным за гэтыя паслугі, неабходна ўвесь час працаваць над пашырэннем спектра, паляпшэннем якасці і даступнасці, вывучаючы і ўлічваючы інтарэсы і пажаданні насельніцтва.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


## Извещение о проведении 24 сентября 2019 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»

### Сведения о продаваемом имуществе

| Номер предмета торгов | Информация о предмете торгов | Стартовая цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 110/С-91200 (назначение — здание специализированное автомобильного транспорта; наименование — гараж) общей площадью 21,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 141000000001004883. Местоположение: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Пролетарская, д. 32/2 | 3360,00 | 336,00 |

**Продавец имущества:** открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.

**Организатор торгов:** консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф. 1703.

Повторные торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в повторных торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется, на расчетный счет консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» № BY23BAPB30122013100380000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, код BAPBBY2X, УНП 190982374, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Повторные торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Повторные торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе повторных торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если повторные торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном условиями проведения торгов. Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 20 банковских дней со дня проведения торгов.

**Повторные торги проводятся 24 сентября 2019 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 22, офис 1703**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 13.09.2019 по 20.09.2019 включительно, в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф. 1703.

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.zalogbanka.by, mail: torgi@agroconsult.by. Телефоны для справок: Tel/Fax +375-17-3996639, MTS +375-29-8166446, VEL +375-44-5406446.



## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Белсвязьстрой» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

**1. Объект недвижимости: административно-хозяйственное здание (административно-бытовой корпус со складскими и вспомогательными помещениями)** *(составные части и принадлежности: проезд, дорожка)* с инв. № 600/С-91465 общей площадью 882,6 кв. м.

**2. Движимое имущество:**

**автоматическая пожарная сигнализация в пос. Колодищи по ул. Промышленной, 24** (инв. № по бух. учету 1868);

**АСКУЭ – автоматическая система контроля и учета электроэнергии** (инв. № по бух. учету 1976);

**оборудование к пожарной автоматической сигнализации в пос. Колодищи** (инв. № по бух. учету 1869);

**система очистки и фильтрации воды в бассейне** (инв. № по бух. учету 2062);

**телефонизация производственной базы пос. Колодищи** (инв. № по бух. учету 1924);

**установка тепловая УТ-15** (инв. № по бух. учету 1842);

**установка тепловая УТ-15** (инв. № по бух. учету 1843);

**установка УТ 20** (инв. № по бух. учету 2008);

**ворота распашные ВРС 4100х4200** (инв. № по бух. учету 1861);

**ворота распашные ВРС 4100х4200** (инв. № по бух. учету 1862);

**ворота секционные СВП-1 3075*3000 мм в комплекте** (инв. № по бух. учету 1864);

**печь HARVIA K-15** (инв. № по бух. учету 1874);

**безинерционный водонагреватель ОКС-500** (инв. № по бух. учету 1859);

**урна металлическая 25 л.** (2 шт.) (инв. № по бух. учету 5207111) (далее — объекты).

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683403101007618 площадью 0,1816 га по адресу: Минская область, Минский район, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Промышленная, 24 (право постоянного пользования).

**Начальная цена с НДС (20 %) – 1 057 725,10 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (105 772,51 бел. руб.).**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Возможно предоставление рассрочки до 1 (одного) года на следующих условиях: 50 (пятьдесят) процентов стоимости имущества оплатить в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи. Оставшаяся сумма оплачивается ежемесячно равными долями в течение срока, на который предоставлена рассрочка. Покупатель имеет право досрочно оплатить стоимость приобретенного объекта.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1,5 (одна целая пять десятых) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **16.10.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.10.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ

# НА КАРЫСЦЬ ГОРАДА

**Дэпутаты гарадскога Савета пагадзіліся з кандыдатурамі жыхароў абласнога цэнтра, якія папоўняць спіс ганаровых грамадзян і Кнігу гонару Гродна. Гэтым разам абраныя алімпійскі чэмпіён, дзеяч культуры і журналіст. Працэдура ўшанавання адбудзецца падчас Дня горада.**



Фота «Гродзенская праўда».

Як паведаміла **старшыня камісіі, намеснік старшыні гарвыканкама Зоя КУЛЕША,** на разгляд паступіла дзве кандыдатуры — Канстанціна Лукашыка і Уладзіміра Сяргейчыка. Ні адна з іх не выклікала спрэчак у камісіі. Адобрылі кандыдатуры і дэпутаты. У рэзюме было падкрэслена, што абодва грoдзенцы зрабілі значны ўнёсак у развіццё горада. Канстанцін Лукашык — алімпійскі чэмпіён 1992 года па кулявой стральбе, неаднаразовы ўдзельнік Алімпіяды. Добра ведаюць у горадзе і Уладзіміра Сяргейчыка. Ён заснавальнік гродзенскіх ансамбляў «Гарадзенскія карункі» і «Забава». Нязменны рэжысёр сямі рэспубліканскіх фестываляў нацыянальных культур.

Такім чынам у спісе зараз амаль 40 ганаровых грамадзян. Ёсць сярод іх і некалькі алімпійскіх чэмпіёнаў, у тым ліку Вольга Корбут і яе трэнер Рэнальд Кныш.

Значная частка ганаровых грамадзян — гэта ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, якія вызвалялі горад, удзельнічалі ў партызанскім руху. Іх імёнамі названы вуліцы горада — Дзмітрый Карбышаў, Іван Болдзін, Герой Савецкага Саюза Іван Лебедзеў, Вольга Соламава. Дарэчы менавіта ветэраны былі ў ліку першых ганаровых грамадзян. А заснавана званне роўна 55 гадоў таму. Пазней, у пачатку 2000-х, рашэннем гарсавета было вырашана прысвойваць ганаровае званне жыхарам горада за грамадскія заслугі, вытворчую дзейнасць, дасягненні ў развіцці навукі, мастацтва, архітэктуры і спорту. Сёння ў спісе — кіраўнікі вядомых гродзенскіх прадпрыемстваў, структур улады, дзеячы культуры. У прыватнасці, Адам Чопчыц — кіраўнік народнага ансамбля песні і танца «Нёман», заслужаны дзеяч культуры Аляксандр Шыдлоўскі, Юрый Якавенка — вядомы мастак, дыпламант шматлікіх міжнародных выставак і конкурсаў.

Дарэчы, званне ганаровага грамадзяніна існавала ў Гродне яшчэ ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. У той час па просьбе гродзенцаў яно было прысвоена пісьменніцы Элізе Ажэшкі.

Але гэта не адзіны статус ушанавання знакамітых гродзенцаў. У горадзе ў 2007 годзе была зацверджана Кніга гонару. І яна штогод папаўняецца новымі імёнамі. Сёлета ў яе будзе занесена імя Аляксандра Ласмінскага — вядомага гродзенскага журналіста, тэлевядучага, заснавальніка першага гарадскога тэлебачання, аўтара не аднаго дзясятка фотаальбомаў аб Прынёманні.

Дарэчы, на разгляд камісіі паступіла некалькі кандыдатур. У іх ліку — былы начальнік будаўнічага ўпраўлення аблвыканкама і гродзенскі архітэктар. Большасць дэпутатаў падтрымалі кандыдатуру Аляксандра Ласмінскага. Цяпер у Кнізе гонару каля 40 чалавек, сярод іх — алімпійскі чэмпіён Іван Ціхан, генеральны дырэктар кампаніі «ЗОВ» Уладзімір Зухавіцкі, трэнер жаночага хакейнага клуба «Рытм» Ніна Дашко, майстар спорту Іван Ядэшка, скульптар Уладзімір Панцялееў, мытнік і краязнавец Віктар Саяпін.

Як адзначыла старшыня камісіі, штогод у Кнігу гонару заносіцца не больш двух імёнаў, столькі ж атрымліваюць званне ганаровых грамадзян. Для апошніх прадугледжваецца і матэрыяльнае заахвочванне — 30 базавых велічынь, а Кніга гонару — гэта прэстыжны праект без выплат.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

ЗАПРАШАЛЬНІК

# БУДЗЕ СВЯТА!

## Мінск і Гродна рады вітаць

**Сталіца на выхадных адзначыць 952-годдзе, а ў горадзе над Нёманам будуць гучаць віншаванні ў гонар 891-га дня нараджэння. Якое і дзе свята наведаць? «МС» пацікавілася праграмамі абодвух. Так што — выбар за вамі!**

### Байкеры, танкісты, рэканструктары і забегі на абцасах

Будучы ўік-энд абяцае мінчанам і гасцям сталіцы шмат атракцый: ужо пачынаючы з пятніцы, можна будзе паўдзельнічаць у закрыцці матасезона на H.O.G. Rally Minsk 2019, арганізатары якога запрашаюць усіх ахвотных на пляцоўку каля Палаца спорту. Дарэчы, у суботу калона байкераў праедзе па горадзе ад Кургана Славы.

Яшчэ адным яскравым момантам свята стане міжнародны фестываль гістарычнай рэканструкцыі, які на працягу двух дзён — суботы і нядзелі — завалодае зялёнай зонай на скрыжаванні праспектаў Машэрава і Пераможцаў.

Музычна-піратэхнічнае фаер-шоу адбудзецца ў акваторыі Свіслачы каля Палаца спорту суботнім вечарам а 23-й гадзіне.

На наступны дзень госці свята змогуць паўдзельнічаць у міжнародным мінскім паўмарафоне і прабегчы на цэнтральных вуліцах горада, а таксама адчуць сябе сапраўдным танкістам на фестывалі Wargaming Fest, які запрашае ў музейна-паркавы комплекс «Перамога».

Шмат цікавінак рыхтуюць і раёны сталіцы: Ленінскі, напрыклад, запрашае на фестываль беларускай традыцыйнай музыкі Rajok, які збірае ахвотных у суботу і нядзелю ў дворыку Нацыянальнага гістарычнага музея, а Цэнтральны ў першы дзень выхадных — у Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы на музейны квэст «Код Купалы», прысвечаны гісторыі Мінска, а таксама на прагляд стужкі «Правілы Геймара» ад «Беларусьфільма» і сустрэчу са здымачнай групай у кінатэатры «Беларусь» і «Кіеў». Заводскі ж раён на пляцоўцы каля «Чыжоўка-Арэны» прапануе дзяўчатам паспаборнічаць у забегах «Абцасік», а малым — на бегавелах.

### Будзе гучна!

14 верасня ўвесь горад заспявае і загучыць на розныя лады: можна будзе акунуцца ў свята духавой, самадзейнай, рок-, поп-, рэтра- і фолькмузыкі! Распачнуць святочныя мерапрыемствы дэфіле аркестра 6-й асобнай механізаванай брыгады і плац-канцэрт роты ганаровага каравула ваеннага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы на вуліцы Горкага. На сцэне ў скверы па гэтай вуліцы амаль цэлы дзень будзе свята музыкі «Па нашай вуліцы з аркестрам». На плошчы Леніна будзе гучаць «Музыка палаканнеў», ахвотных запрашаюць на рэтра-свята і гастра-фэст на свежым паветры.

У гарадскім парку імя Жылібера пройдзе свята музыкі і дзяцінства, на пляцоўцы каля Маладзёжнага цэнтра «Гродна» — чакае «Стрыт-фолк-рок».

Асабнае месца ў свяце належыць традыцыйнаму фестывалю сыру, які сёлета адбудзецца на ЦСК «Нёман». Усім прапануюць паўдзельнічаць у сырнай дэгустацыі, «баях гладыятараў» і масавым флэш-мобе.

Агні Гродна прадэманструе падчас святочнага салюту, які запланаваны а 22-й гадзіне ў Каложскім парку.


## Извещение о проведении 15 октября 2019 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Озерицкий-Агро»

### Сведения о продаваемом имуществе

| Лот | Информация о предмете торгов | Стартовая цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| № 1 | Изолированное помещение (квартира) № 1 общей площадью 81,1 кв. м, 1989 года постройки. Местоположение: Минская обл., Смолевичский р-н, Заболотский с/с, д. Смольница, д. 25. Кадастровый номер земельного участка 624882005601000152 | 22 320,00 в том числе НДС 20 % | 1 116,00 в том числе НДС 20 % |

**Продавец имущества:** открытое акционерное общество «Озерицкий-Агро», 222215, Минская область, Смолевичский район, аг. Слобода, ул. Центральная, 7.

**Организатор аукциона:** консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф.1703.

Торги проводятся в форме *открытого аукциона* в соответствии со ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию Свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» № BY23-BAPB30122013100380000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 190982374, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном условиями проведения торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение **20 банковских дней** со дня проведения аукциона

**Торги проводятся 15 октября 2019 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 22, оф. 1703**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 13.09.2019 по 11.10.2019 включительно, в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф. 1703.

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.zalogbanka.by, mail: torgi@agroconsult.by

Телефоны для справок: организатор аукциона: Tel/Fax 8 (017) 399 66 39, GSM MTS 8 (029) 816-64-46, GSM VEL 8 (044) 540-64-46.



**Общество с ограниченной ответственностью «ЭФФРОН»**, далее именуемое «Общество», юридическое лицо, созданное и действующее по законодательству Республики Беларусь, зарегистрированное 26.05.1992 года Администрацией Фрунзенского района г. Минска, УНП 100181958, расположенное по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 10, кв. 30, настоящим объявляет об утрате:

(1) печати Общества;

(2) свидетельства о государственной регистрации Общества;

(3) устава Общества;

(4) всех иных корпоративных документов Общества (протоколов, решений и т. д.), документов по учету кадров Общества, документов по хозяйственной деятельности.

По состоянию на дату настоящей публикации вышеуказанные объекты не были найдены и отсутствуют в распоряжении Общества.



**ОБЪЯВЛЕНИЕ**

**25 сентября 2019 года состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Камволь»**

Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176, демонстрационный зал, 2-й этаж главного корпуса.

**Повестка дня**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Камволь».
2. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, 211 каб., тел. 223-16-22

Начало работы собрания — 15.00.

Регистрация участников собрания: с 14.30 до 15.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 16.09.2019 г.

Для регистрации при себе иметь паспорт.

УНП 100074393.



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**

220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 12 верасня 2019 года.**